ЗАЦВЕРДЖАНА

Пастанова
Міністэрства адукацыі
Рэспублікі Беларусь
29.07.2025 № 135

Вучэбная праграма па вучэбным прадмеце «Геаграфія»
для X–XI класаў устаноў адукацыі, якія рэалізуюць адукацыйныя
праграмы агульнай сярэдняй адукацыі,
з беларускай мовай навучання і выхавання
(павышаны ўзровень)

# ГЛАВА 1
# АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

1. Дадзеная вучэбная праграма па вучэбным прадмеце «Геаграфія» (далей – вучэбная праграма) прызначана для вывучэння гэтага вучэбнага прадмета на павышаным узроўні ў X–XI класах устаноў адукацыі, якія рэалізуюць адукацыйныя праграмы агульнай сярэдняй адукацыі.

2. Вучэбная праграма разлічана на 204 гадзіны:

для X класа – на 102 гадзіны (3 гадзіны ў тыдзень), з іх на абагульняючае паўтарэнне – 4 гадзіны, 2 гадзіны – рэзервовы час;

для XI класа – на 102 гадзіны (3 гадзіны ў тыдзень), з іх на абагульняючае паўтарэнне – 9 гадзін, 1 гадзіна – рэзервовы час.

3. Мэта навучання вучэбнаму прадмету «Геаграфія» на III ступені агульнай сярэдняй адукацыі – фарміраванне ў вучняў геаграфічнай культуры і сістэмы ведаў аб прыродных і сацыяльна-эканамічных працэсах у свеце, асобных рэгіёнах, краінах, Рэспубліцы Беларусь; навучанне выкарыстанню геаграфічных ведаў у штодзённым жыцці; развіццё кампетэнцый вучняў – вучэбна-пазнавальнай, прыярытэту геаграфічнай інфармацыі, каштоўнасна-сэнсавай, геаграфічных дзеянняў, прасторавага арыентавання і камунікатыўнай.

4. Задачы навучання вучэбнаму прадмету «Географія»:

фарміраванне ў вучняў ведаў аб геаграфічнай абалонцы Зямлі, тэрытарыяльнай арганізацыі эканамічнага жыцця грамадства, узаемадзеянні чалавечага грамадства і прыроднага асяроддзя;

фарміраванне ўменняў характарызаваць фізіка-геаграфічныя асаблівасці прыроды мацерыкоў і акіянаў, вылучаць агульныя і адметныя тэрытарыяльныя асаблівасці, эканоміка-геаграфічныя паказчыкі асобных краін, асаблівасці геаграфічнага і геапалітычнага распалажэння тэрыторый, стратэгіі ўстойлівага развіцця чалавецтва і Рэспублікі Беларусь;

развіццё ў вучняў здольнасцей бачыць і разумець геаграфічную карціну свету, усведамляць сваю ролю і прызначэнне ў свеце; умення выбіраць мэтавыя і сэнсавыя ўстаноўкі для сваіх дзеянняў, прымаць рашэнні;

фарміраванне ўмення працаваць з картаграфічнымі крыніцамі інфармацыі: авалоданне практычнымі прыёмамі работы з картай, асэнсаванне зместу карты, развіццё прасторавага ўяўлення; выкарыстанне інфармацыі аб геаграфічных працэсах і з’явах (графічнай, статыстычнай, даведачнай, краязнаўчай) і ажыццяўленне прасторава-тэрытарыяльнай прывязкі;

развіццё ў вучняў здольнасцей да камунікатыўнай дзейнасці: умення геаграфічна аргументаваць вынікі назіранняў за працэсамі, якія

адбываюцца ў прыродзе і грамадстве, падаваць іх рознымі спосабамі; ўменне выкарыстоўваць міжасобасныя формы ўзаемадзеяння і зносін у працэсе навучання.

5. Рэкамендуюцца наступныя метады навучання і выхавання: гутарка, тлумачэнне, самастойная работа, наглядныя метады, выкананне практычных работ і іншыя метады. З мэтай актывізацыі пазнавальнай дзейнасці вучняў выкарыстоўваюцца метады праблемнага разгляду, эўрыстычныя, даследчыя, метад праектаў, дыскусіі і іншыя метады.

У працэсе навучання мэтазгодна спалучаць формы навучання, якія прадугледжваюць арганізацыю актыўнай вучэбна-пазнавальнай дзейнасці вучняў па засваенні зместу адукацыі: франтальныя, групавыя, парныя і індывідуальныя.

Формы і метады навучання і выхавання педагагічны работнік выбірае самастойна, зыходзячы з мэт і задач вывучэння канкрэтнай тэмы.

6. Чаканыя вынікі вывучэння зместу вучэбнага прадмета «Геаграфія» па завяршэнні навучання і выхавання на III ступені агульнай сярэдняй адукацыі:

6.1. асобасныя:

валодае сучасным светапоглядам, сістэмай каштоўнасных арыентацый, ідэйна-маральных, культурных і этычных прынцыпаў і норм паводзін;

разумее значнасць геаграфічнай адукацыі для асобаснага развіцця і самавызначэння;

усведамляе сябе членам грамадства на глабальным, рэгіянальным і лакальным узроўнях;

мае ўяўленне аб Рэспубліцы Беларусь як суб’екце сусветнай геаграфічнай прасторы, яе месцы і ролі ў сучасным свеце;

усведамляе гуманістычную сутнасць і маральную каштоўнасць навуковых ведаў, значнасць беражлівага стаўлення да прыроды Зямлі і прыродакарыстання, неабходнасць разумна выкарыстоўваць дасягненні геаграфічнай навукі ў інавацыйным развіцці грамадства;

выказвае гатоўнасць да выбару далейшай адукацыйнай траекторыі ў адпаведнасці са сваімі магчымасцямі, здольнасцямі і інтарэсамі.

6.2. метапрадметныя:

дэманструе ўстойлівую цікавасць да вучэбных дзеянняў (рэгулятыўных, вучэбна-пазнавальных, камунікатыўных, кааператыўных);

здольны ацэньваць інфармацыю і выказваць доказныя меркаванні, размяжоўваючы факты і разважанні; прымаць рашэнні ва ўмовах залішняй колькасці або недахопу інфармацыі; адаптуецца да розных жыццёвых сітуацый;

умее: крытычна мысліць і працаваць з інфармацыяй, вылучаць у ёй галоўнае; крытычна ацэньваць інфармацыю, атрыманую з розных крыніц, пісьменна інтэрпрэтаваць яе і выкарыстоўваць; адрозніваць істотныя прыметы працэсаў і з’яў ад неістотных; бачыць некалькі варыянтаў вырашэння праблемы, выбіраць найбольш аптымальны варыянт; інтэграваць веды з розных прадметных галін для вырашэння практычных задач;

праяўляе цікавасць да новых форм вучэбнай дзейнасці (практычнай, даследчай, праектнай, іншых форм).

6.3. прадметныя:

валодае геаграфічнымі ведамі, уменнямі, навыкамі, спосабамі дзейнасці, неабходнымі пры вывучэнні іншых прадметаў;

валодае ведамі пра аб’екты вывучэння фізічнай і сацыяльна-эканамічнай геаграфіі, уменнямі, навыкамі і спосабамі дзейнасці;

умее характарызаваць фізіка-геаграфічныя асаблівасці прыроды мацерыкоў і акіянаў, вылучае агульныя і адметныя тэрытарыяльныя асаблівасці, эканоміка-геаграфічныя паказчыкі асобных краін, асаблівасці геаграфічнага і геапалітычнага распалажэння тэрыторый, стратэгіі ўстойлівага развіцця і Рэспублікі Беларусь;

умее выбіраць мэтавыя і сэнсавыя ўстаноўкі для сваіх дзеянняў, прымаць рашэнні; здольны бачыць і разумець навакольны свет, усведамляць сваю ролю;

мае вопыт дзейнасці па выкарыстанні геаграфічных ведаў і ўменняў у жыццёвых сітуацыях;

умее працаваць з картаграфічнымі крыніцамі інфармацыі, выкарыстоўваць інфармацыю аб геаграфічных працэсах і з’явах і ажыццяўляць прасторава-тэрытарыяльную прывязку;

здольны да камунікатыўнай дзейнасці: умее геаграфічна аргументаваць вынікі назіранняў за працэсамі, якія адбываюцца ў прыродзе і грамадстве, падаваць іх рознымі спосабамі.

## ГЛАВА 2
## ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА ПРАДМЕТА Ў X КЛАСЕ. АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

(3 гадзіны ў тыдзень; усяго 102 гадзіны, з іх на абагульняючае паўтарэнне – 4 гадзіны і 2 гадзіны – рэзервовы час)

### УВОДЗІНЫ (1 гадзіна)

Сацыяльна-эканамічная геаграфія свету. Асноўныя напрамкі, месца ў сістэме геаграфічных навук. Роля ва ўмовах глабалізацыі і забеспячэнні

ўстойлівага развіцця.

## СУЧАСНАЯ ПАЛІТЫЧНАЯ КАРТА СВЕТУ І ПАЛІТЫЧНАЯ ГЕАГРАФІЯ (8 гадзін)

### Тэма 1. Дынаміка палітычнай карты свету (3 гадзіны)

Аб’екты палітычнай карты свету. Дзяржаўная тэрыторыя. Суверэнныя дзяржавы, залежныя тэрыторыі, іх дынаміка. Самаабвешчаныя (непрызнаныя) дзяржавы, квазідзяржавы. Прасторавыя формы дзяржаў. Роля сталіц у кіраванні дзяржаўнай тэрыторыяй, віды сталіц.

Міжнародныя тэрыторыі, Антарктыка, адкрытае мора, касмічная прастора. Роля Арганізацыі Аб'яднаных Нацый (далей – ААН) у фарміраванні палітычнай карты свету.

Рэгіянальныя і лакальныя канфлікты на палітычнай карце свету, класіфікацыя, прычыны і наступствы. Узброеныя канфлікты. Геаканфлікталогія.

## АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Вучні:

ведаюць:

пра асноўныя аб’екты палітычнай карты свету; прасторавыя формы дзяржаў, міжнародныя тэрыторыі;

самаабвешчаныя (непрызнаныя, часткова прызнаныя) дзяржавы; класіфікацыю рэгіянальных і лакальных канфліктаў;

асноўныя паняцці: квазідзяржава, сепаратызм, геаканфлікталогія;

умеюць:

характарызаваць дынаміку палітычнай карты свету, ролю сталіц у кіраванні дзяржаўнай тэрыторыяй;

прыводзіць прыклады залежных тэрыторый і паказваць іх на карце;

тлумачыць ролю ААН у фарміраванні палітычнай карты свету;

называць і паказваць на карце самаабвешчаныя (непрызнаныя, часткова прызнаныя) дзяржавы;

аналізаваць прычыны і наступствы лакальных і ўзброеных канфліктаў.

### Тэма 2. Палітычная геаграфія і геапалітыка (5 гадзін)

Палітычная геаграфія, прадмет, аб’ект і асноўныя напрамкі. Палітыка-геаграфічнае становішча краіны. Дзяржаўныя межы і формы змянення меж. Памежныя спрэчкі. Прыкладная роля палітычнай геаграфіі.

Геапалітыка, аб’ект, прадмет, месца ў сістэме геаграфічных навук. Прастора ў геапалітыцы. Геапалітычныя фактары развіцця краіны. Геапалітычныя працэсы свету ў канцы XX – пачатку XXI стагоддзя. Электаральная геаграфія.

Практычная работа

1. Параўнальная характарыстыка дзяржаўных меж і тэрыторыі дзвюх краін свету (на выбар).

2. Параўнальная характарыстыка палітыка-геаграфічнага становішча дзвюх краін (на выбар) згодна з тыпавым планам.

3. Міратворчыя місіі ААН: гісторыя, прычыны і геаграфія.

## АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Вучні:

ведаюць:

прадмет, аб’ект і асноўныя напрамкі палітычнай геаграфіі; аб’ект, прадмет геапалітыкі; геапалітычныя фактары развіцця краіны; аб памежных спрэчках на палітычнай карце свету;

асноўныя паняцці: палітычная геаграфія, палітыка-геаграфічнае становішча, геапалітыка, геапалітычнае поле, электаральная геаграфія;

умеюць:

характарызаваць прыкладную ролю палітычнай геаграфіі, дзяржаўныя межы і тэрытарыяльныя спрэчкі, палітыка-геаграфічнае становішча краіны, прастору ў геапалітыцы;

тлумачыць сучасныя геапалітычныя працэсы, геапалітычныя фактары развіцця краіны;

складаць параўнальную характарыстыку дзяржаўных меж і тэрыторыі дзяржавы;

складаць параўнальную характарыстыку палітыка-геаграфічнага становішча краін;

складаць характарыстыку міратворчых місій ААН: гісторыя, прычыны, геаграфія.

## ГЕАГРАФІЯ НАСЕЛЬНІЦТВА СВЕТУ (28 гадзін)

### Тэма 3. Геаграфія дэмаграфічных працэсаў (11 гадзін)

Дэмаграфічныя працэсы і іх геаграфія. Дэмаграфічная сітуацыя. Фактары і геаграфія нараджальнасці насельніцтва ў свеце і рэгіёнах. Прагноз нараджальнасці насельніцтва ў свеце. Геаграфія смяротнасці і працягласці жыцця насельніцтва ў свеце. Геаграфія распаўсюджання сіндрому набытага імунадэфіцыту чалавека. Прагноз смяротнасці

насельніцтва ў свеце.

Натуральны рух насельніцтва свету, характар і асноўныя фактары. Геаграфія натуральнага прыросту і натуральнага змяншэння насельніцтва ў свеце. Адрозненні паміж развітымі краінамі і краінамі, якія развіваюцца, у характары натуральнага руху насельніцтва, асноўныя прычыны.

Узнаўленне насельніцтва свету, асноўныя характарыстыкі і тыпы. Пашыраны, просты і звужаны тыпы ўзнаўлення насельніцтва. Геаграфія тыпаў узнаўлення, фактары і адрозненні ў свеце і рэгіёнах. Фактары адрозненняў паміж развітымі краінамі і краінамі, якія развіваюцца.

Полаўзроставая структура, асноўныя віды. Узроставая структура насельніцтва і фактары, якія яе вызначаюць. Тыпы ўзроставай структуры насельніцтва: прагрэсіўны, стацыянарны, рэгрэсіўны. Полаўзроставая піраміда і яе віды. Геаграфічныя адрозненні ўзроставай структуры насельніцтва ў свеце. Структура насельніцтва па поле ў свеце і геаграфічныя адрозненні.

Дэмаграфічнае старэнне, асноўныя паказчыкі. Шкала старэння (ААН, Э. Росета). Прычыны і наступствы старэння. Геаграфія старэння ў свеце, адрозненні паміж развітымі краінамі і краінамі, якія развіваюцца. Прагноз дэмаграфічнага старэння.

Тэорыя дэмаграфічнага пераходу. Першы дэмаграфічны пераход, асноўныя фазы, характарыстыкі і геаграфія. Другі і трэці дэмаграфічныя пераходы, асноўныя рысы і адрозненні. Геаграфія другога і трэцяга дэмаграфічных пераходаў у свеце.

Дынаміка колькасці насельніцтва, асноўныя паказчыкі і вызначальныя фактары. Размеркаванне краін свету па колькасці насельніцтва, асноўныя групы краін і рэгіянальныя асаблівасці. Найбуйнейшыя дзяржавы свету па колькасці насельніцтва. Тэмпы дынамікі колькасці насельніцтва ў свеце і рэгіёнах. Прагноз колькасці насельніцтва свету (паводле звестак ААН).

Практычная работа

4. Параўнальна-геаграфічная характарыстыка нараджальнасці насельніцтва свету (на прыкладзе дзвюх краін на выбар).

5. Характар натуральнага руху насельніцтва ў развітых краінах і краінах, якія развіваюцца (параўнанне дзвюх краін на выбар).

6. Параўнальная характарыстыка полаўзроставай структуры насельніцтва развітых краін і краін, якія развіваюцца (з пабудовай полаўзроставай піраміды, на прыкладзе дзвюх краін на выбар).

7*[7]. Геаграфія дэмаграфічнага старэння (работа з контурнай картай па шкале старэння).

---

[7]Выніковыя практычныя работы, пазначаныя знакам «*», могуць быць выкананы ў рамках тэматычнага

# АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Вучні:

ведаюць:

паказчыкі, фактары дэмаграфічнай сітуацыі; геаграфію нараджальнасці, смяротнасці і працягласці жыцця насельніцтва свету; характар натуральнага руху насельніцтва ў свеце і рэгіёнах; тыпы ўзнаўлення насельніцтва і сутнасць дэмаграфічнага пераходу; тыпы ўзроставай структуры насельніцтва, віды полаўзроставых пірамід, тыпы структуры насельніцтва згодна з полам; прагноз колькасці насельніцтва свету;

асноўныя паняцці: дэмаграфічная сітуацыя, натуральны рух насельніцтва, узнаўленне насельніцтва, полаўзроставая структура, дэмаграфічнае старэнне, дэмаграфічны пераход;

умеюць:

тлумачыць уплыў фактараў на дэмаграфічную сітуацыю, на адрозненні нараджальнасці, смяротнасці, натуральнага прыросту (змяншэння) насельніцтва ў развітых краінах і краінах, якія развіваюцца; на ўзроставую структуру насельніцтва;

характарызаваць дэмаграфічную сітуацыю ў рэгіёнах і свеце, геаграфію нараджальнасці, смяротнасці, натуральнага прыросту, натуральнага змяншэння насельніцтва ў свеце; дэмаграфічны пераход у свеце, дынаміку колькасці насельніцтва ў рэгіёнах і свеце, тыпы ўзнаўлення і ўзроставай структуры насельніцтва ў рэгіёнах свету; структуру насельніцтва згодна з полам, прычыны, геаграфію і наступствы дэмаграфічнага старэння;

прыводзіць прыклады краін з пашыраным, простым, звужаным тыпамі ўзнаўлення насельніцтва, перавагай жаночага насельніцтва ў структуры, мужчынскага насельніцтва ў структуры, прыкладна роўнай колькасцю мужчынскага і жаночага насельніцтва;

складаць параўнальна-геаграфічную характарыстыку нараджальнасці насельніцтва свету; полаўзроставай структуры насельніцтва развітых краін і краін, якія развіваюцца;

параўноўваць і тлумачыць падабенствы і адрозненні ў характары натуральнага руху насельніцтва развітых краін і краін, якія развіваюцца;

параўноўваць характар натуральнага руху насельніцтва ў развітых краінах і краінах, якія развіваюцца (на прыкладзе дзвюх краін на выбар);

будаваць полаўзроставую піраміду;

выкарыстоўваць шкалу старэння для адлюстравання на контурнай

---

кантролю.

карце геаграфіі дэмаграфічнага старэння;

называць і паказваць на карце: пяць найбуйнейшых краін свету па колькасці насельніцтва (Кітай, Індыя, Злучаныя Штаты Амерыкі (далей – ЗША), Інданезія, Пакістан); краіну з максімальнай нараджальнасцю ў свеце (Нігер); краіну з максімальнай смяротнасцю насельніцтва ў свеце (Балгарыя); краіны з мінімальнай нараджальнасцю насельніцтва ў свеце (Рэспубліка Карэя, Манака); краіны з мінімальнай смяротнасцю насельніцтва ў свеце (Катар, Аб’яднаныя Арабскія Эміраты); краіну з максімальным натуральным прыростам насельніцтва (Нігер); краіну з максімальным натуральным змяншэннем насельніцтва (Балгарыя); краіну з максімальнай доляй насельніцтва ва ўзросце 60 гадоў і больш (Японія); краіны з прагрэсіўнай узроставай структурай насельніцтва (Малаві, Тайланд, Парагвай), стацыянарнай узроставай структурай насельніцтва (Аўстралія, Чылі, Эквадор) і рэгрэсіўнай узроставай структурай насельніцтва (Грэцыя, Японія, Германія); краіны са станоўчай дынамікай колькасці насельніцтва (Нігерыя, Егіпет, Малайзія), адмоўнай дынамікай колькасці насельніцтва (Японія, Германія, Італія).

Тэма 4. Геаграфія міжнароднай міграцыі (7 гадзін)

Міграцыя насельніцтва, фактары. Законы міграцыі. Віды міграцыі па геаграфічным ахопе, часе, мэтах, форме арганізацыі, ступені легальнасці. Асноўныя паказчыкі міграцыі. Міграцыйны пераход.

Міжнародная міграцыя ў сучасным свеце. Фактары і дынаміка маштабаў у свеце і рэгіёнах. Геаграфія эміграцыі і іміграцыі ў свеце. Міграцыя ў развітых краінах і краінах, якія развіваюцца, падабенствы і адрозненні. Асноўныя калідоры міжнароднай міграцыі.

Сучасныя формы міжнароднай міграцыі. Геаграфія палітычнай, эканамічнай, працоўнай, экалагічнай, студэнцкай міграцыі. Фактары і адрозненні паміж развітымі краінамі і краінамі, якія развіваюцца. Асноўныя цэнтры прыцягнення міжнародных мігрантаў.

Бежанства ў сучасным свеце, прычыны і геаграфія. Жэнеўская канвенцыя аб статусе бежанцаў. Еўрапейскі міграцыйны крызіс. Міграцыйная палітыка.

Практычная работа

8. Аналіз фактараў і дынамікі аб’ёмаў міжнароднай міграцыі ў свеце.

9. Характарыстыка асноўных калідораў міжнароднай міграцыі згодна з тыпавым планам.

10. Міграцыйная сітуацыя ў Еўропе: перавагі, праблемы, погляд у будучыню (падрыхтоўка эсэ).

## АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Вучні:

ведаюць:

фактары і законы міжнароднай міграцыі, віды міграцыі па геаграфічным ахопе, часе, мэтах, форме арганізацыі, ступені легальнасці; асноўныя калідоры і сучасныя формы міжнароднай міграцыі; асноўныя рэгіёны і наступствы бежанства;

асноўныя паняцці: міграцыйны пераход, міграцыйная палітыка;

умеюць:

характарызаваць дынаміку аб’ёмаў міжнароднай міграцыі ў свеце і рэгіёнах; асноўныя цэнтры прыцягнення міжнародных мігрантаў;

тлумачыць падабенствы і адрозненні ў міграцыях паміж развітымі краінамі і краінамі, якія развіваюцца;

аналізаваць геаграфію палітычнай, эканамічнай, экалагічнай, студэнцкай міграцыі;

вызначаць асноўныя рэгіёны і наступствы бежанства;

абгрунтоўваць неабходнасць міграцыйнай палітыкі;

характарызаваць фактары і дынаміку маштабаў міжнароднай міграцыі ў свеце; асноўныя калідоры міжнароднай міграцыі;

тлумачыць асаблівасці і перспектывы міграцыйнай сітуацыі ў Еўропе;

называць і паказваць на карце: асноўныя калідоры міжнародных міграцый, тры краіны паходжання найбольшай колькасці бежанцаў; тры краіны з найбольшай доляй імігрантаў у структуры насельніцтва; краіны з найбольшай колькасцю бежанцаў.

### Тэма 5. Геаграфія рассялення свету (10 гадзін)

Размяшчэнне насельніцтва свету, паказчыкі і фактары. Шчыльнасць насельніцтва свету. Густа- і маланаселеныя арэалы. Геаграфія шчыльнасці насельніцтва свету. Палосы канцэнтрацыі насельніцтва ў рэгіёнах свету. Унутрыкраінавая дыферэнцыяцыя шчыльнасці насельніцтва.

Геаграфія рассялення свету, фактары і заканамернасці, формы рассялення. Тыпы рассялення, асноўныя прыметы гарадскога і сельскага рассялення. Функцыянальныя тыпы гарадскога і сельскага рассялення.

Урбанізацыя свету, фактары і стадыі. Кропкавы горад, агламерацыя, мегалаполіс, асноўныя прыметы і адметныя рысы. Адрозненні ў стадыях урбанізацыі паміж развітымі краінамі і краінамі, якія развіваюцца.

Геаграфія ўрбанізацыі ў свеце. Урбанізацыйны пераход. Адрозненні рэгіёнаў свету, развітых краін і краін, якія развіваюцца, па долі гарадскога насельніцтва. Дынаміка колькасці гарадскога насельніцтва і тэмпаў урбанізацыі ў свеце. Прагноз колькасці гарадскога насельніцтва ў свеце.

Геаграфія гарадоў свету. Дынаміка і геаграфія найбуйнейшых агламерацый у свеце. Мегалаполісы свету, паказчыкі параўнання. Геаграфія найбуйнейшых мегалаполісаў развітых краін і краін, якія развіваюцца.

Трушчобнае гарадское рассяленне ў сучасным свеце. Асноўныя прыметы і разнавіднасці па краінах свету. Геаграфія і адрозненні па рэгіёнах свету. Найбуйнейшыя трушчобы свету і праблемы іх развіцця.

Практычная работа

11*. Два партрэты урбанізацыі: падабенствы і адрозненні паміж развітымі і краінамі, якія развіваюцца (на прыкладзе дзвюх краін на выбар) згодна з тыпавым планам.

12. Вызначэнне функцыянальнага тыпу горада (на прыкладзе трох гарадоў на выбар).

13. Геаграфія найбуйнейшых агламерацый свету (работа з контурнай картай).

14. Параўнальна-геаграфічная характарыстыка мегалаполісаў свету (на прыкладзе двух) згодна з тыпавым планам.

## АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Вучні:

ведаюць:

паказчыкі і фактары размяшчэння насельніцтва; густа-і маланаселеныя арэалы, палосы канцэнтрацыі насельніцтва ў рэгіёнах свету; формы рассялення; стадыі і формы ўрбанізацыі; геаграфію найбуйнейшых агламерацый, мегалаполісаў, трушчоб свету;

асноўныя паняцці: размяшчэнне насельніцтва, рассяленне, агламерацыя, мегалаполіс, мегасіці;

умеюць:

тлумачыць уплыў фактараў на размяшчэнне насельніцтва; урбанізацыю;

характарызаваць геаграфію шчыльнасці насельніцтва свету, унутрыкраінавую дыферэнцыяцыю па шчыльнасці насельніцтва; формы рассялення, прыметы гарадскога і сельскага рассялення; стадыі і формы ўрбанізацыі; адрозненні ва ўрбанізацыі паміж развітымі і краінамі, якія развіваюцца; гарадскія трушчобы ў сучасным свеце;

выяўляць прычыны і тлумачыць асноўныя прыметы трушчобнага гарадскога рассялення ў свеце;

прыводзіць прыклады найбуйнейшых трушчоб свету;

называць і паказваць на карце: краіну з максімальнай шчыльнасцю насельніцтва ў свеце; краіну з мінімальнай шчыльнасцю насельніцтва ў свеце; краіны з максімальнай доляй гарадскога насельніцтва; краіну з мінімальнай доляй гарадскога насельніцтва; тры найбуйнейшыя агламерацыі свету; мегалаполісы Паўночна-Усходні (Басваш), Прыазёрны (Чыпітс), Візагмахангар (Індыя, Бангладэш), Сан-Рыа (Бразілія); тры краіны з трушчобным характарам рассялення;

складаць характарыстыку падабенстваў і адрозненняў ва ўрбанізацыі паміж развітымі краінамі і краінамі, якія развіваюцца; вызначаць функцыянальны тып горада; параўноўваць мегалаполісы свету; адлюстроўваць на контурнай карце геаграфію найбуйнейшых агламерацый свету.

## ГЕАГРАФІЯ СУСВЕТНАЙ ГАСПАДАРКІ (59 гадзін)

### Тэма 6. Структура і фактары развіцця сусветнай гаспадаркі (14 гадзін)

Сусветная гаспадарка, этапы фарміравання і стадыі развіцця. Паказчыкі развіцця сусветнай гаспадаркі. Прасторавыя мадэлі развіцця сусветнай гаспадаркі (двучленная, трохчленная, мнагачленная).

Структура сусветнай гаспадаркі: сектаральная, галіновая, тэрытарыяльная. Парытэт пакупніцкай здольнасці (далее – ППЗ). Тэндэнцыі развіцця сусветнай гаспадаркі ў XXI стагоддзі, павелічэнне разрыву ва ўзроўні сацыяльна-эканамічнага развіцця паміж дзяржавамі. Фарміраванне цэнтраў сусветнай гаспадаркі.

Постіндустрыялізм як стадыя сусветнай гаспадаркі. Асноўныя прыметы і паказчыкі постіндустрыяльнага развіцця сусветнай гаспадаркі. Узровень постіндустрыяльнага развіцця краін свету.

Глабалізацыя сусветнай гаспадаркі, перадумовы, асноўныя этапы і тыпы. Эканамічная глабалізацыя: формы, перавагі і перспектывы. Глабальныя гарады. Гісторыя паходжання. Разнавіднасці глабальных гарадоў і рэгіянальная структура.

Сеткавая эканоміка, перадумовы ўзнікнення і асноўныя рысы. Фактары развіцця сеткавай эканомікі. Новыя віды эканамічнай дзейнасці сеткавай эканомікі. Геаграфія і асноўныя транснацыянальныя карпарацыі (далей – ТНК).

Міжнародныя арганізацыі сістэмы ААН па супрацоўніцтве ў эканамічнай дзейнасці. Група Сусветнага банка, Канферэнцыя ААН па гандлі і развіцці (ЮНКТАД), ААН па прамысловым развіцці (ЮНІДА), Праграма ААН па навакольным асяроддзі (ЮНЕП), Харчовая і сельскагаспадарчая арганізацыя ААН (ФАО).

Міжнародны геаграфічны падзел працы (далей – МГПП). Фактары МГПП. Гістарычныя тыпы МГПП. Міжнародная спецыялізацыя і кааператанне. Найноўшыя змяненні ў міжнародным падзеле працы.

Інтэрнацыяналізацыя сусветнай гаспадаркі. Паказчыкі інтэрнацыяналізацыі: экспартная квота, імпартная квота, знешнегандлёвая квота. Транснацыяналізацыя сусветнай гаспадаркі, перадумовы працэсу. Віды ТНК. Геаграфія, рэгіянальная і галіновая структура ТНК. Найбуйнейшыя ТНК свету, галіновая спецыялізацыя.

Міжнародная эканамічная інтэграцыя, перадумовы, стадыі. Перавагі і выдаткі эканамічнай інтэграцыі. Вядучыя эканамічныя інтэграцыйныя аб’яднанні свету і іх роля ў развіцці сучаснай сусветнай гаспадаркі. Роля ЕС ў развіцці сусветнай гаспадаркі і сучасныя праблемы развіцця.

Навукова-тэхнічны прагрэс (далей – НТП) і яго роля ў развіцці сусветнай гаспадаркі. Асноўныя напрамкі навукова-тэхнічнай рэвалюцыі (далей – НТР). Уплыў навукова-даследчых і вопытна-канструктарскіх распрацовак (далей – НДВКР) на галіновую і тэрытарыяльную структуру сусветнай гаспадаркі. Высокатэхналагічныя галіны, віды эканамічнай дзейнасці.

Міжнародны гандаль, геаграфічная і галіновая структура. Дынаміка аб’ёмаў, галіновая і рэгіянальная структура сусветнага экспарту і імпарту тавараў. Дынаміка аб’ёмаў, галіновая і рэгіянальная структура сусветнага экспарту і імпарту паслуг. Рэгуляванне міжнароднага гандлю, роля Сусветнай гандлёвай арганізацыі.

Экалагізацыя сусветнай гаспадаркі. Перадумовы эколага-арыентаваных змяненняў у сусветнай гаспадарцы. Уплыў экалагізацыі на галіновую структуру сусветнай гаспадаркі. Зялёная эканоміка, яе асноўныя прынцыпы і распаўсюджанне ў свеце.

Практычная работа

15*. Вызначэнне фактараў міжнароднага геаграфічнага падзелу працы краін свету (на прыкладзе аднаго рэгіёна свету).

16. Еўрапейскі саюз (ЕС) і Пагадненне Злучаных Штатаў Амерыкі, Мексікі і Канады (ЮСМКА): роля ў сусветнай гаспадарцы, падабенствы і адрозненні развіцця.

## АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Вучні:

ведаюць:

асноўныя этапы фарміравання і стадыі развіцця сусветнай гаспадаркі; прасторавыя мадэлі развіцця сусветнай гаспадаркі; пра гістарычныя тыпы і

асноўныя формы міжнароднага геаграфічнага падзелу працы; перадумовы транснацыяналізацыі, разнавіднасці і геаграфію найбуйнейшых ТНК; асноўныя напрамкі НТР і новыя віды эканамічнай дзейнасці; стадыі міжнароднай эканамічнай інтэграцыі, вядучыя эканамічныя інтэграцыйныя аб’яднанні свету; перадумовы ўзнікнення, прынцыпы функцыянавання найбуйнейшых сеткавых структур у свеце; перадумовы, асноўныя этапы глабалізацыі сусветнай гаспадаркі; формы эканамічнай глабалізацыі, геаграфію глабальных гарадоў; асноўныя прынцыпы і распаўсюджанне зялёнай эканомікі ў свеце;

асноўныя паняцці: галіновая структура сусветнай гаспадаркі, ППЗ, тэрытарыяльная структура сусветнай гаспадаркі, глабалізацыя сусветнай гаспадаркі, глабальны горад, сеткавая эканоміка, міжнародны геаграфічны падзел працы, інтэрнацыяналізацыя, транснацыяналізацыя, ТНК, міжнародная эканамічная інтэграцыя, НТП, НТР, міжнародны гандаль, зялёная экалагізацыя сусветнай гаспадаркі;

умеюць:

характарызаваць прасторавыя мадэлі развіцця сусветнай гаспадаркі; структуру сусветнай гаспадаркі; стадыі міжнароднай эканамічнай інтэграцыі; дынаміку аб’ёмаў, галіновую і рэгіянальную структуру сусветнага экспарту і імпарту тавараў і паслуг;

аналізаваць фактары і гістарычныя тыпы МГПП; ТНК; фактары і ўмовы міжнароднай эканамічнай інтэграцыі;

тлумачыць найноўшыя змяненні ў МГПП; уплыў НДВКР на галіновую і тэрытарыяльную структуру сусветнай гаспадаркі; асаблівасці геаграфіі, рэгіянальнай і галіновай структуры ТНК; ролю вядучых інтэграцыйных аб’яднанняў у развіцці сучаснай сусветнай гаспадаркі; перадумовы ўзнікнення і рысы сеткавай эканомікі; перадумовы экалага-арыентаваных змяненняў у сусветнай гаспадарцы, уплыў экалагізацыі на галіновую структуру сусветнай гаспадаркі, ролю міжнародных спецыялізаваных арганізацый ААН па рэгуляванні сусветнага развіцця;

вызначаць разнавіднасці сетак у сусветнай гаспадарцы;

аналізаваць ролю і выяўляць падабенствы і адрозненні развіцця Еўрапейскага саюза (далей – ЕС) і Паўночнаамерыканскай зоны свабоднага гандлю;

называць і паказваць на карце: тры найбуйнейшыя ТНК свету; гарады, якія лідзіруюць па колькасці штаб-кватэр ТНК; тры вядучыя інтэграцыйныя аб’яднанні свету: ЕС, Пагадненне Злучаных Штатаў Амерыкі, Мексікі і Канады (ЮСМКА), агульны рынак краін Паўднёвай Амерыкі (МЕРКАСУР); тры дзяржавы, якія лідзіруюць па аб’ёмах: гандлю таварамі і долі ў міжнародным гандлі таварамі, гандлю паслугамі і долі ў

міжнародным гандлі паслугамі; глабальныя гарады (Нью-Ёрк, Лондан, Парыж, Токіа, Ганконг).

Тэма 7. Геаграфія сельскай гаспадаркі свету (9 гадзін)

Агульная характарыстыка сусветнай сельскай гаспадаркі, структура і геаграфічныя тыпы. Занятасць у сельскай гаспадарцы ў свеце, развітых краінах і краінах, якія развіваюцца. Роля прыродных і сацыяльна-эканамічных фактараў размяшчэння сельскагаспадарчай вытворчасці. Структура сельскагаспадарчых угоддзяў свету і рэгіёнаў. Геаграфічныя тыпы сельскай гаспадаркі свету.

Агульная характарыстыка геаграфіі раслінаводства, фактары размяшчэння, структура па рэгіёнах і відах вытворчасцей. Геаграфія міжнароднага гандлю прадукцыяй раслінаводства.

Геаграфія збожжавай гаспадаркі свету. Фактары размяшчэння збожжавай гаспадаркі. Рэгіянальныя адрозненні структуры збожжавай гаспадаркі. Геаграфія вытворчасці пшаніцы, рысу, кукурузы.

Геаграфія тэхнічных культур у свеце. Агульная структура тэхнічных культур. Рэгіянальная структура і геаграфія харчовых тэхнічных культур (алейныя, цукраносныя, крухмаланосныя, танізавальныя культуры).

Геаграфія жывёлагадоўлі, фактары размяшчэння. Структура жывёлагадоўлі па відах вытворчасцей у свеце, напрамкі развіцця ў развітых краінах і краінах, якія развіваюцца. Геаграфія жывёлагадоўлі, свінагадоўлі, авечкагадоўлі. Аграрная палітыка ў краінах ЕС.

Роля НДВКР у развіцці сельскай гаспадаркі. Генетычна мадыфікаваныя арганізмы у сельскай гаспадарцы. Арганічная сельская гаспадарка: сутнасць, значэнне, фактары размяшчэння і геаграфія. Адрозненні паміж развітымі краінамі і краінамі, якія развіваюцца.

Практычная работа

17. Эканоміка-геаграфічны аналіз збожжавай гаспадаркі свету (работа з контурнай картай).

18. Аналіз геаграфіі арганічнай сельскай гаспадаркі свету згодна з тыпавым планам.

19. Аналіз геаграфіі міжнароднага гандлю прадукцыяй сельскай гаспадаркі (работа з контурнай картай).

АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ
ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Вучні:

ведаюць:

значэнне прыродных рэсурсаў і сацыяльна-эканамічных умоў у размяшчэнні сельскагаспадарчай вытворчасці; структуру сельскагаспадарчых угоддзяў свету і рэгіёнаў; асноўныя геаграфічныя тыпы сельскай гаспадаркі свету;

асноўныя паняцці: геаграфічны тып сельскай гаспадаркі; арганічная сельская гаспадарка;

умеюць:

характарызаваць прыродныя і сацыяльна-эканамічныя фактары размяшчэння сельскагаспадарчай вытворчасці; геаграфію вырошчвання генетычна мадыфікаваных сельскагаспадарчых культур і арганічнай сельскай гаспадаркі;

тлумачыць геаграфічныя асаблівасці раслінаводства, геаграфічныя асаблівасці жывёлагадоўлі;

аналізаваць геаграфію збожжавай гаспадаркі і тэхнічных культур свету, геаграфію міжнароднага гандлю прадукцыяй сельскай гаспадаркі; геаграфію арганічнай сельскай гаспадаркі і міжнародны гандаль прадукцыяй сельскай гаспадаркі;

вызначаць ролю НДВКР у развіцці сельскай гаспадаркі;

працаваць з контурнай картай падчас аналізу збожжавай гаспадаркі свету;

называць і паказваць на карце: тры вядучыя краіны па аб’ёмах валавога збору пшаніцы, кукурузы, рысу, сланечніка, бульбы, цукровага трыснягу, чаю, какава-бабоў, кофе, вытворчасці бавоўны-валакна; па пагалоўі буйной рагатай жывёлы, свіней, авечак.

### Тэма 8. Геаграфія лясной гаспадаркі свету (3 гадзіны)

Структура лясной гаспадаркі свету. Лесапрамысловы комплекс свету, галіновая структура. Сыравінная база лесапрамысловага комплексу свету. Паясны характар размяшчэння і занальныя адрозненні. Лясістасць краін свету. Дынаміка плошчы лясоў па рэгіёнах і групах краін.

Геаграфія асноўных відаў вытворчасцей лесапрамысловага комплексу. Лесанарыхтоўчая прамысловасць. Вытворчасць ліставога драўнянага матэрыялу. Вытворчасць паперы і кардону. Геаграфія міжнароднага гандлю прадукцыяй лесапрамысловага комплексу свету. Найбуйнейшыя ТНК.

Практычная работа

20. Аналіз лясістасці і дынамікі плошчаў лясоў у рэгіёнах свету (работа з контурнай картай).

## АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Вучні:

ведаюць:

сучасную структуру лясной гаспадаркі свету; геаграфію асноўных відаў вытворчасцей лесапрамысловага комплексу свету; геаграфію міжнароднага гандлю прадукцыяй лесапрамысловага комплексу свету;

асноўны тэрмін: лесапрамысловы комплекс;

умеюць:

характарызаваць сыравінную базу лесапрамысловага комплексу свету, лясістасць краін свету, геаграфію вытворчасці паліўнай драўніны, дзелавой драўніны, ліставага драўнянага матэрыялу, паперы і кардону;

аналізаваць лясістасць і дынаміку плошчаў лясоў па рэгіёнах і групах краін свету з выкарыстаннем контурнай карты;

называць і паказваць на карце тры вядучыя сусветныя краіны: з найбольшымі плошчамі лясоў; найбольшай лясістасцю; найбольшай вытворчасцю паліўнай драўніны; найбольшай вытворчасцю дзелавой драўніны; найбольшай вытворчасцю ліставага драўнянага матэрыялу; найбольшай вытворчасцю паперы і кардону.

### Тэма 9. Геаграфія рыбалоўства і аквакультуры (2 гадзіны)

Месца і роля рыбалоўства ў структуры сусветнай гаспадаркі. Геаграфія і маштабы сусветнага рыбалоўства. Галоўныя рыбалоўныя раёны свету. Геаграфія міжнароднага гандлю прадукцыяй рыбалоўства. Геаграфія і тыпы аквакультуры. Прэснаводная і марская аквакультура. Вядучыя экспарцёры і імпарцёры аквакультуры.

Практычная работа

21. Параўнальны аналіз рыбалоўства ў Атлантычным і Ціхім акіянах па тыпавым плане.

## АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Вучні:

ведаюць:

месца рыбалоўства ў структуры сусветнай гаспадаркі; галоўныя рыбалоўныя раёны свету;

асноўны тэрмін: аквакультура;

умеюць:

характарызаваць геаграфію сусветнага рыбалоўства, размеркаванне сусветнага ўлову рыбы і морапрадуктаў па акіянах, геаграфію

міжнароднага гандлю прадукцыяй рыбалоўства, геаграфію спажывання рыбы і морапрадуктаў, геаграфію аквакультуры;

параўноўваць рыбалоўства ў Атлантычным і Ціхім акіянах па тыпавым плане;

называць і паказваць на карце: тры вядучыя краіны з найбольшым уловам рыбы; найбольшымі аб’ёмамі вытворчасці аквакультуры.

Тэма 10. Геаграфія прамысловасці свету (18 гадзін)

Прамысловасць свету, фактары, мадэлі размяшчэння і агульная характарыстыка. Структура прамысловасці свету, галіны прамысловасці і віды эканамічнай дзейнасці. Здабыўная і апрацоўчая галіны прамысловасці і іх суадносіны. Уплыў НТР на галіновую структуру прамысловасці свету.

Геаграфія мінеральна-сыравінных рэсурсаў свету. Класіфікацыя мінеральна-сыравінных рэсурсаў. Геаграфія энергетычных рэсурсаў. Геаграфія рудных карысных выкапняў. Геаграфія нярудных карысных выкапняў.

Геаграфія энергетыкі свету. Геаграфія нафтавай, газавай, вугальнай прамысловасці. Дынаміка і рэгіянальная структура сусветнай здабычы нафты, прыроднага газу, вугалю. Геаграфія міжнароднага гандлю нафтай, прыродным газам, вугалем. Роля Міжнароднай міжурадавай арганізацыі нафтаздабыўных краін (АПЕК).

Геаграфія традыцыйнай электраэнергетыкі. Размеркаванне вытворчасці электраэнергіі па краінах і рэгіёнах. Тыпы краін па структуры электраэнергетыкі. Цеплавая электраэнергетыка. Гідраэнергетыка. Найбуйнейшыя гідраэлектрастанцыі свету. Міжнародны гандаль электраэнергіяй.

Геаграфія альтэрнатыўнай энергетыкі. Ветравая, геатэрмальная, сонечная, прыліўная энергетыка. Перспектывы развіцця альтэрнатыўных відаў энергіі. Геаграфія ядзернай энергетыкі, сыравінная база, найбуйнейшыя АЭС у свеце. Роля Міжнароднага агенцтва па атамнай энергіі (МАГАТЭ) у развіцці сусветнай ядзернай энергетыкі.

Геаграфія металургіі свету. Фактары размяшчэння металургічных вытворчасцей. Структура чорнай металургіі па відах вытворчасцей. Геаграфія вытворчасці чыгуну і сталі. Рэгіёны чорнай металургіі свету. Міжнародны гандаль прадукцыяй чорнай металургіі.

Геаграфія каляровай металургіі свету, роля ў сусветнай гаспадарцы. Структура галіны. Фактары размяшчэння і геаграфія алюмініевай прамысловасці свету. Найбуйнейшыя ТНК у алюмініевай прамысловасці.

Геаграфія меднай, цынкавай, свінцовай прамысловасці; фактары размяшчэння. Канцэнтрацыя вытворчасцей. Геаграфія міжнароднага гандлю. Найбуйнейшыя ТНК.

Геаграфія машынабудавання свету, структура і фактары размяшчэння. Уплыў НДВКР на структурныя і тэрытарыяльныя зрухі ў машынабудаванні. Геаграфія асноўных падгалін машынабудавання: транспартнае машынабудаванне (марское суднабудаванне, аўтамабілебудаванне, авіяракетна-касмічная прамысловасць), электронная і электратэхнічная прамысловасць, станкабудаванне. Найбуйнейшыя ТНК аўтамабілебудавання. Геаграфія міжнароднага гандлю прадукцыяй машынабудавання.

Геаграфія хімічнай прамысловасці свету, структура, роля ў развіцці сусветнай гаспадаркі. Фактары размяшчэння хімічных вытворчасцей. Сучасныя змяненні ў хімічнай прамысловасці развітых краін і краін, якія развіваюцца. Рэгіёны хімічнай прамысловасці свету.

Геаграфія хімічных вытворчасцей мінеральных угнаенняў, прадуктаў неарганічнай хіміі і арганічнага сінтэзу. Геаграфія фармацэўтычнай прамысловасці. Найбуйнейшыя галіны ТНК. Геаграфія міжнароднага гандлю хімічнай прадукцыяй.

Геаграфія высокатэхналагічных галін свету. Высокатэхналагічныя вытворчасці ў сусветнай гаспадарцы. Міжнародная спецыялізацыя і геаграфія высокатэхналагічнай прадукцыі. Вядучыя экспарцёры і імпарцёры высокатэхналагічнай прадукцыі.

Лёгкая і харчовая прамысловасць свету. Месца гэтых галін у апрацоўчай прамысловасці. Структура лёгкай і харчовай прамысловасці па відах вытворчасцей. Геаграфія тэкстыльнай і швейнай прамысловасці. Геаграфія міжнароднага гандлю прадукцыяй лёгкай і харчовай прамысловасці.

Практычная работа

22. Аналіз геаграфіі запасаў і здабычы энергетычных рэсурсаў свету (на прыкладзе нафты і прыроднага газу).

23. Параўнальны аналіз геаграфіі сыравіннай базы і геаграфіі ядзернай энергетыкі свету.

24. Вызначэнне геаграфічных асаблівасцей выплаўкі чыгуну і сталі (на ўзроўні рэгіёнаў і вядучых краін).

25. Геаграфічны аналіз алюмініевай прамысловасці свету (работа з контурнай картай).

26. Аналіз геаграфіі аўтамабілебудавання свету (работа з контурнай картай свету).

27*. Фармацэўтыка свету: геаграфія і рэгіянальныя адрозненні.

28. Параўнальная характарыстыка найбуйнейшых ТНК свету (на прыкладзе трох кампаній на выбар) згодна з тыпавым планам.

# АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Вучні:

ведаюць:

мадэлі размяшчэння, структуру прамысловасці свету; асаблівасці мінеральна-сыравіннай базы прамысловасці; геаграфію нафтавай, газавай і вугальнай прамысловасці, электраэнергетыкі, альтэрнатыўнай энергетыкі свету; сыравінную базу і галіновую структуру чорнай і каляровай металургіі, найбуйнейшыя ТНК металургіі (ArcelorMittal (Люксембург), China Baowu Group (Кітай), Nippon Steel & Sumitomo Metal Corporation (Японія)); галіновую структуру машынабудавання, найбуйнейшыя ТНК аўтамабілебудавання (Toyota Motor, Volkswagen Group, Daimler); фактары размяшчэння хімічных вытворчасцей; геаграфію сыравіннай базы хімічнай прамысловасці; рэгіёны хімічнай прамысловасці свету; галіновую структуру, фактары і геаграфічныя асаблівасці размяшчэння лёгкай прамысловасці, харчовай прамысловасці;

асноўныя паняцці: НТР, рэсурсазабяспечанасць, альтэрнатыўная энергетыка;

умеюць:

тлумачыць уплыў фактараў на размяшчэнне галін сусветнай гаспадаркі; заканамернасці размяшчэння галін сусветнай гаспадаркі;

характарызаваць сучасную прамысловасць свету; геаграфію мінеральна-сыравінных рэсурсаў свету; геаграфію нафтавай, газавай і вугальнай прамысловасці свету; геаграфію традыцыйнай электраэнергетыкі свету; геаграфію альтэрнатыўнай энергетыкі свету; геаграфію чорнай металургіі свету, геаграфію каляровай металургіі свету; геаграфію машынабудавання свету; геаграфію хімічнай прамысловасці свету; геаграфію лёгкай прамысловасці свету; геаграфію харчовай прамысловасці свету;

аналізаваць геаграфію запасаў і здабычы энергетычных рэсурсаў свету (на прыкладзе нафты і прыроднага газу); алюмініевай прамысловасці свету; аўтамабілебудавання свету; геаграфію і рэгіянальныя адрозненні фармацэўтычнай прамысловасці свету;

вызначаць геаграфічныя асаблівасці выплаўкі чыгуну і сталі (на ўзроўні рэгіёнаў і вядучых краін);

параўноўваць геаграфію сыравіннай базы і геаграфію ядзернай энергетыкі свету;

параўноўваць найбуйнейшыя ТНК згодна з тыпавым планам;

называць і паказваць на карце: тры вядучыя краіны па аб’ёмах разведаных запасаў нафты, разведаных запасаў прыроднага газу, разведаных запасаў вугалю, разведаных запасаў жалезных руд; тры

вядучыя нафтаздабыўныя краіны, газаздабыўныя краіны, вуглездабыўныя краіны; тры вядучыя краіны з ліку вытворцаў электраэнергіі; тры найбуйнейшыя гідраэлектрастанцыі свету; тры найбуйнейшыя атамныя электрастанцыі свету; тры вядучыя краіны з ліку вытворцаў сонечнай электраэнергіі; тры вядучыя краіны з ліку вытворцаў ветравой электраэнергіі; тры галоўныя краіны з ліку вытворцаў геатэрмальнай электраэнергіі; тры вядучыя краіны па аб'ёмах вытворчасці: чыгуну, сталі, першаснага алюмінію, рафінаванай медзі, рафінаванага цынку, рафінаванага свінцу; тры вядучыя краіны з ліку вытворцаў: марскіх суднаў, легкавых аўтамабіляў, станкоў, калійных угнаенняў, азотных угнаенняў, фосфарных угнаенняў, хімічных валокнаў; тры вядучыя краіны па вытворчасці: мяса, малака, швейнай прадукцыі.

Тэма 11. Геаграфія сектара паслуг свету (12 гадзін)

Сектар паслуг у сусветнай гаспадарцы, адрозненні ў структуры развітых краін і краін, якія развіваюцца. Фактары дынамікі развіцця сектара паслуг. Міжнародныя галіновыя класіфікатары паслуг. Геаграфія і галіновая структура сектара паслуг.

Геаграфія сектара інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій (далей – ІКТ) свету. МГПП у сектары ІКТ. Узровень развіцця і адрозненні ва ўзроўні развіцця ІКТ паміж развітымі краінамі і краінамі, якія развіваюцца.

Геаграфія сферы НДВКР свету. Навука як самастойная галіна сусветнай гаспадаркі ў структуры сектара паслуг. Асноўныя паказчыкі ўзроўню развіцця навуковай сферы. Рэгіёны сучаснай навукі і іх міжнародная спецыялізацыя. Навукова-тэхналагічныя цэнтры свету.

Геаграфія транспарту свету. Геаграфія сусветнага чыгуначнага транспарту, месца і роля ў сусветнай транспартнай сістэме. Дынаміка груза- і пасажыраабароту. Структура грузаабароту. Адрозненні ў развіцці чыгуначнага транспарту паміж развітымі краінамі і краінамі, якія развіваюцца. Хуткасныя чыгуначныя магістралі.

Геаграфія сусветнага аўтамабільнага транспарту, месца і роля ў сусветнай транспартнай сістэме. Дынаміка груза- і пасажыраабароту. Структура грузаабароту. Адрозненні ў развіцці аўтамабільнага транспарту паміж развітымі краінамі і краінамі, якія развіваюцца. Аўтамагістралі ў сучасным аўтамабільным транспарце.

Геаграфія сусветнага воднага транспарту, яго месца і роля ў сусветнай транспартнай сістэме. Дынаміка груза- і пасажыраабароту. Структура грузаабароту. Найбуйнейшыя парты свету. Роля танных (зручных) сцягоў у развіцці сусветнага марскога транспарту.

Геаграфія сусветнага авіяцыйнага транспарту, месца і роля ў сусветнай транспартнай сістэме.Дынаміка груза- і пасажыраабароту. Структура грузаабароту. Найбуйнейшыя аэрапорты свету. Роля лаўкостэраў у развіцці сусветнага авіяцыйнага транспарту.

Кантэйнерызацыя транспарту свету. Перадумовы і гісторыя развіцця кантэйнернага транспарту ў свеце. Найбуйнейшыя кантэйнерныя парты свету. Транспартныя масты.

Геаграфія міжнароднага турызму. Роля міжнароднага турызму ў развіцці сусветнай гаспадаркі і сферы паслуг. Рэгіянальныя асаблівасці турысцкага патэнцыялу і яго выкарыстання. Геаграфія турысцкіх патокаў свету. Засваенне новых тэрыторый свету для развіцця турызму на постіндустрыяльнай стадыі.

Геаграфія фінансавых паслуг у свеце. Найбуйнейшыя фінансавыя цэнтры свету. Міжнародныя фінансавыя арганізацыі і іх роля ў развіцці сусветнай гаспадаркі. Майнінг. Крыптавалюта і яе роля ў сусветнай гаспадарцы. Геаграфія экспарту і імпарту фінансавых паслуг.

Практычная работа

29*. Параўнальны аналіз геаграфіі і структуры экспарту паслуг у развітых краінах і краінах, якія развіваюцца.

30. Геаграфічная характарыстыка сусветнага марскога транспарту (работа з контурнай картай).

31. Параўнальная характарыстыка геаграфіі турызму ў рэгіёнах свету (на прыкладзе Еўропы і Азіі).

## АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Вучні:

ведаюць:

месца сферы паслуг у сусветнай гаспадарцы; фактары дынамікі развіцця сферы паслуг; галіновую структуру сферы паслуг; галіновую структуру транспартнага комплексу свету; асаблівасці геаграфіі відаў транспарту (чыгуначнага, аўтамабільнага, воднага, авіяцыйнага); асаблівасці геаграфіі міжнароднага турызму; асаблівасці геаграфіі фінансавых паслуг і геаграфіі сектара ІКТ свету;

асноўныя паняцці: транспартная сістэма свету; турысцка-рэкрэацыйныя рэсурсы; міжнародны фінансавы цэнтр, майнінг, крыптавалюта, аўтсорсінг; тэхнаполіс; лічбавая эканоміка;

умеюць:

тлумачыць асаблівасці структуры грузаабароту чыгуначнага, аўтамабільнага, воднага, авіяцыйнага транспарту; асаблівасці структуры

пасажыраабароту чыгуначнага, аўтамабільнага, воднага, авіяцыйнага транспарту;

аналізаваць геаграфію відаў транспарту (чыгуначнага, аўтамабільнага, воднага, авіяцыйнага); кантэйнерызацыю транспарту свету; геаграфію міжнароднага турызму;

характарызаваць сусветны сектар ІКТ, геаграфію сферы НДВКР свету; фактары размяшчэння і адметныя рысы геаграфіі чыгуначнага, аўтамабільнага, марскога, рачнога, авіяцыйнага транспарту;

параўноўваць геаграфію і структуру экспарту паслуг у развітых краінах і краінах, якія развіваюцца; геаграфію турызму ў рэгіёнах свету;

называць і паказваць на карце: тры вядучыя краіны свету па аб'ёме экспарту паслуг, імпарту паслуг; тры вядучыя марскія порты свету па грузаабароце; тры вядучыя кантэйнерныя марскія порты свету; тры вядучыя аэрапорты свету па пасажыраабароце; тры вядучыя дзяржавы па колькасці турысцкіх прыбыццяў; тры найбуйнейшыя фінансавыя цэнтры свету; прыклады тэхнаполісаў свету; тры вядучыя краіны па развіццю ІКТ.

### Заключэнне (1 гадзіна)

## ГЛАВА 3
## ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА ПРАДМЭТА Ў XI КЛАСЕ. АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

(3 гадзіны ў тыдзень; усяго 102 гадзіны, з іх на абагульняючае паўтарэнне – 9 гадзін і 1 гадзіна – рэзервовы час)

### УВОДЗІНЫ (1 гадзіна)

Глабальныя праблемы чалавецтва і роля геаграфіі ў іх вырашэнні. Асаблівасці геаграфічнага падыходу да вывучэння глабальных праблем.

### АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Вучні:

ведаюць:

пра ролю геаграфіі ў вырашэнні глабальных праблем чалавецтва; асноўныя групы глабальных праблем чалавецтва; асаблівасці геаграфічнага падыходу да вывучэння глабальных праблем чалавецтва; значэнне гуманітарна-экалагічнага падыходу да вырашэння глабальных праблем чалавецтва;

асноўныя паняцці: геаэкалагічныя глабальныя праблемы, глабальныя праблемы чалавецтва, гуманітарна-экалагічны падыход, сацыяльна-эканамічныя глабальныя праблемы;

умеюць:

аналізаваць ролю геаграфіі ў вырашэнні глабальных праблем чалавецтва;

характарызаваць асноўныя групы глабальных праблем чалавецтва;

вызначаць асаблівасці геаграфічнага падыходу да вывучэння глабальных праблем чалавецтва;

характарызаваць асноўныя функцыі геаграфічнай абалонкі;

абгрунтоўваць значэнне гуманітарна-экалагічнага падыходу да вырашэння глабальных праблем чалавецтва.

## ГЕАЭКАЛАГІЧНЫЯ ПРАБЛЕМЫ ГЕАГРАФІЧНАЙ АБАЛОНКІ (37 гадзін)

### Тэма 1. Геаэкалагічныя праблемы літасферы (7 гадзін)

Літасфера. Гісторыя фарміравання літасферы і сучасныя асаблівасці развіцця. Сучасныя ўяўленні аб тэктанічных працэсах і ўтварэнні тэктанічных структур. Асноўныя тыпы горных парод і мінералаў зямной кары.

Гісторыя паходжання і фарміравання сучаснага рэльефу Зямлі. Сучасныя ўнутраныя і знешнія прыродныя працэсы ўтварэння рэльефу. Глабальныя рысы рэльефу Зямлі. Асаблівасці эпох гораўтварэння. Паходжанне асноўных араграфічных структур на Зямлі.

Геаэкалагічныя функцыі літасферы: рэсурсная, геадынамічная, геафізічная і геахімічная. Геаэкалагічныя асаблівасці літасферы. Вялікі (геалагічны) кругаварот рэчываў. Роля біёты, чалавека і яго гаспадарчай дзейнасці ў вялікім (геалагічным) кругавароце рэчываў.

Прыродныя прычыны трансфармацыі літасферы. Асноўныя прыродныя прычыны змянення функцый літасферы. Уплыў сучасных тэктанічных і геамарфалагічных працэсаў на стан навакольнага асяроддзя.

Уплыў дзейнасці чалавека на літасферу. Геаэкалагічныя змены навакольнага асяроддзя падчас разведкі, здабычы, транспарціроўкі і выкарыстання карысных выкапняў. Уплыў горных работ на атмасферу і гідрасферу. Рацыянальнае выкарыстанне і ахова нетраў Зямлі. Рэкультывацыя парушаных ландшафтаў, яе асноўныя этапы і напрамкі.

Практычная работа

1. Аналіз прычын змянення геаэкалагічных функцый літасферы.

2. Параўнальная характарыстыка асноўных напрамкаў рэкультывацыі парушаных ландшафтаў.

## АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Вучні:

ведаюць:

гісторыю фарміравання літасферы і сучасныя асаблівасці яе развіцця; сучасныя ўяўленні аб тэктанічных працэсах і ўтварэнні тэктанічных структур; сучасныя ўнутраныя і знешнія прыродныя працэсы ўтварэння рэльефу; асаблівасці эпох гораўтварэння; геаэкалагічныя асаблівасці літасферы і яе асноўныя функцыі; асноўныя прыродныя і антрапагенныя прычыны змянення літасферы; асноўныя геаэкалагічныя наступствы ўплыву дзейнасці чалавека на літасферу;

асноўныя паняцці: геаэкалагічныя наступствы, біёта, вялікі (геалагічны) кругаварот рэчываў, рэкультывацыя;

умеюць:

выяўляць значэнне элементаў літасферы для розных відаў гаспадарчай дзейнасці;

аналізаваць наступствы антрапагеннага ўздзеяння на літасферу; прычыны змянення геаэкалагічных функцый літасферы;

характарызаваць асаблівасці праяўлення геаэкалагічных праблем літасферы на розным тэрытарыяльным узроўні;

характарызаваць і даваць параўнальную характарыстыку асноўным напрамкам рэкультывацыі парушаных зямель;

прыводзіць прыклады праяўлення геаэкалагічных функцый літасферы ў сваёй мясцовасці, іх уплыву на чалавека і яго гаспадарчую дзейнасць;

называць і паказваць на карце тэрыторыі, дзе адбыліся прыродныя і антрапагенныя змяненні літасферы на розным тэрытарыяльным узроўні.

### Тэма 2. Геаэкалагічныя праблемы атмасферы (10 гадзін)

Атмасфера. Утварэнне атмасферы і яе эвалюцыя. Асноўныя кліматаўтваральныя працэсы, іх роля ў фарміраванні клімату і надвор’я.

Заканамернасці развіцця кліматычнай сістэмы Зямлі. Прасторава-часавыя заканамернасці кліматычнай сістэмы Зямлі. Геаграфічныя фактары клімату.

Геаэкалагічныя асаблівасці атмасферы. Ахоўныя функцыі атмасферы. Значэнне атмасферы для чалавека і яго гаспадарчай дзейнасці. Уздзеянне сонечнай радыяцыі, атмасфернага ціску, ветру, вільготнасці і тэмпературы паветра на чалавека.

Кліматычныя рэсурсы. Занальна-рэгіянальныя асаблівасці кліматычных рэсурсаў. Уплыў дзейнасці чалавека на атмасферу, клімат і надвор’е. Забруджванне атмасферы і яго ўздзеянне на біёту і чалавека.

Крыніцы і найважнейшыя кампаненты антрапагеннага забруджвання атмасферы. Прасторава-часавыя заканамернасці распаўсюджвання розных відаў антрапагенных забруджвальнікаў атмасферы.

Антрапагеннае змяненне клімату. Парніковы эфект. Асноўныя газы з парніковым эфектам. Уздзеянне трапасферных аэразоляў на парніковы эфект. Гідракліматычныя наступствы антрапагеннага парніковага эфекту. Роля антрапагеннага фактару ў дэградацыі азонавага слоя, выпадзенні кіслотных ападкаў і лакальным забруджванні паветра.

Экстрэмальныя кліматычныя з’явы. Асноўныя прычыны змянення клімату. Уплыў антрапагеннага ўздзеяння на змяненне клімату.

Уплыў змянення клімату на чалавека і яго гаспадарчую дзейнасць. Геаэкалагічныя наступствы ўздзеяння магчымых змяненняў клімату на прыроду, гаспадарчую дзейнасць і здароўе чалавека. Асноўныя напрамкі аховы атмасферы. Метады і спосабы зніжэння ўзроўню антрапагеннага забруджвання атмасферы.

Практычныя работы

3. Ацэнка кліматычных умоў сваёй мясцовасці, іх уплыў на чалавека і яго гаспадарчую дзейнасць.

4. Аналіз геаэкалагічных наступстваў магчымага змянення клімату.

## АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Вучні:

ведаюць:

гісторыю ўтварэння атмасферы і сучасныя асаблівасці яе эвалюцыі; пра ролю асноўных клліматаўтваральных працэсаў у фарміраванні клімату і надвор’я; прасторава-часавыя заканамернасці кліматычнай сістэмы Зямлі; геаэкалагічныя асаблівасці атмасферы; ролю кліматычных і пагодных умоў у жыцці чалавека і яго гаспадарчай дзейнасці; занальна-рэгіянальныя асаблівасці кліматычных рэсурсаў; асноўныя крыніцы, найважнейшыя кампаненты і прасторава-часавыя заканамернасці распаўсюджвання антрапагеннага забруджвання атмасферы; экстрэмальныя кліматычныя з’явы, сучасныя тэндэнцыі і геаэкалагічныя наступствы змянення клімату; асноўныя напрамкі аховы атмасферы;

асноўныя паняцці: кліматычныя рэсурсы, парніковы эфект, змяненне клімату, экстрэмальныя кліматычныя з’явы;

умеюць:

выяўляць значэнне кліматычных і ўмоў надвор’я для розных відаў гаспадарчай дзейнасці;

аналізаваць прычыны і наступствы антрапагеннага ўздзеяння на стан атмасферы і клімат; геаэкалагічныя наступствы магчымага змянення клімату;

характарызаваць асаблівасці праяўлення геаэкалагічных праблем атмасферы на розным тэрытарыяльным узроўні;

прыводзіць прыклады ўплыву кліматычных і пагодных умоў сваёй мясцовасці на чалавека і яго гаспадарчую дзейнасць;

характарызаваць і ацэньваць кліматычныя ўмовы сваёй мясцовасці;

характарызаваць уплыў кліматычных умоў на чалавека і яго гаспадарчую дзейнасць;

называць і паказваць на карце тэрыторыі, дзе адбыліся прыродныя і антрапагенныя змяненні атмасферы на розным тэрытарыяльным узроўні.

Тэма 3. Геаэкалагічныя праблемы гідрасферы (10 гадзін)

Гідрасфера. Асаблівасці фарміравання гідрасферы і тэндэнцыі яе сучасных змяненняў. Асноўныя геаграфічныя асаблівасці і заканамернасці функцыянавання гідрасферы.

Сусветны акіян. Асноўныя структурныя кампаненты Сусветнага акіяна. Прасторава-часавыя асаблівасці марфаметрычных і гідралагічных характарыстык Сусветнага акіяна. Прыродныя рэсурсы Сусветнага акіяна.

Геаэкалагічныя асаблівасці гідрасферы. Асноўныя геаэкалагічныя функцыі гідрасферы і яе значэнне для жыцця людзей. Водныя рэсурсы і водазабеспячанасць. Занальныя і рэгіянальныя асаблівасці водазабяспечанасці краін свету.

Уплыў дзейнасці чалавека на воды сушы. Уплыў розных відаў гаспадарчай дзейнасці чалавека на колькасць і якасць водных рэсурсаў. Крыніцы і віды антрапагеннага забруджвання вод сушы. Уплыў забруджвання вады на чалавека і біёту.

Геаэкалагічныя аспекты воднай гаспадаркі. Дэфіцыт і дэградацыя вод сушы. Праблемы кіравання водаспажываннем. Рэгуляванне і перакідванне рачнога сцёку. Рацыянальнае выкарыстанне мінеральных і тэрмальных вод.

Геаэкалагічныя праблемы Сусветнага акіяна. Антрапагеннае ўздзеянне на Сусветны акіян. Геаэкалагічныя наступствы забруджвання Сусветнага акіяна.

Рэгіянальныя і лакальныя геаэкалагічныя праблемы Сусветнага акіяна. Геаэкалагічныя аспекты выкарыстання прыродных рэсурсаў Сусветнага акіяна. Рэгіянальныя і лакальныя геаэкалагічныя праблемы акіянаў, унутраных мораў і марскіх узбярэжжаў.

Рацыянальнае выкарыстанне і ахова водных рэсурсаў. Асноўныя напрамкі павышэння эфектыўнасці выкарыстання і аховы водных рэсурсаў сушы і Сусветнага акіяна. Метады і спосабы зніжэння ўзроўню антрапагеннага забруджвання гідрасферы.

Практычная работа

5. Аналіз рэгіянальных асаблівасцей водазабяспечанасці краін свету.

6. Геаэкалагічная ацэнка стану водных рэсурсаў сваёй мясцовасці і аналіз мерапрыемстваў па іх ахове.

## АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Вучні:

ведаюць:

асаблівасці фарміравання гідрасферы і тэндэнцыі яе сучасных змяненняў; асноўныя геаграфічныя асаблівасці і заканамернасці функцыянавання гідрасферы; прасторава-часавыя асаблівасці марфаметрычных і гідралагічных характарыстык Сусветнага акіяна; структуру і асноўныя тыпы прыродных рэсурсаў Сусветнага акіяна; геаэкалагічныя асаблівасці гідрасферы; пра сучасны геаэкалагічны стан элементаў гідрасферы; занальныя і рэгіянальныя асаблівасці водазабяспечанасці краін свету; асноўныя крыніцы і віды антрапагеннага забруджвання гідрасферы; геаэкалагічныя аспекты выкарыстання прыродных рэсурсаў Сусветнага акіяна; рэгіянальныя і лакальныя геаэкалагічныя праблемы акіянаў, унутраных мораў і марскіх узбярэжжаў; асноўныя напрамкі павышэння эфектыўнасці выкарыстання і аховы водных рэсурсаў сушы і Сусветнага акіяна;

асноўныя паняцці: водны баланс, водная гаспадарка, водазабяспечанасць;

умеюць:

выяўляць значэнне элементаў гідрасферы для розных відаў гаспадарчай дзейнасці;

аналізаваць прычыны і наступствы антрапагеннага ўздзеяння на гідрасферу; рэгіянальныя асаблівасці водазабяспечанасці краін свету;

характарызаваць асаблівасці праяўлення геаэкалагічных праблем гідрасферы на розным тэрытарыяльным узроўні;

характарызаваць уплыў розных відаў гаспадарчай дзейнасці на колькасць і якасць водных рэсурсаў;

прыводзіць прыклады ўплыву гідралагічных умоў сваёй мясцовасці на чалавека і яго гаспадарчую дзейнасць;

ажыццяўляць геаэкалагічную ацэнку стану водных рэсурсаў сваёй мясцовасці і аналізаваць мерапрыемствы па іх ахове;

называць і паказваць на карце тэрыторыі, дзе адбыліся прыродныя і антрапагенныя змяненні гідрасферы на розным тэрытарыяльным узроўні.

Тэма 4. Геаэкалагічныя праблемы біясферы (10 гадзін)

Біясфера. Асаблівасці фарміравання і развіцця біясферы. Прасторава-часавыя заканамернасці размеркавання жывых арганізмаў у біясферы. Прычыны разнастайнасці жывых арганізмаў на Зямлі.

Геаэкалагічныя асаблівасці біясферы. Роля біясферы ў геаграфічнай абалонцы і яе значэнне для жыцця людзей. Уплыў дзейнасці чалавека на біясферу. Сучасныя ландшафты Зямлі.

Глебавае покрыва Зямлі. Асноўныя фактары глебаўтварэння. Прасторава-часавыя заканамернасці фарміравання глебавага покрыва. Роля глеб у фарміраванні прыроднай разнастайнасці Зямлі. Геаграфічныя заканамернасці распаўсюджвання асноўных тыпаў глеб. Гарызантальная і вертыкальная занальнасць глеб. Азанальныя глебы.

Уплыў прыродных фактараў і дзейнасці чалавека на зямельныя і глебавыя рэсурсы. Геаэкалагічныя асаблівасці глеб і іх узаемадзеянне з геасферамі. Зямельныя і глебавыя рэсурсы. Дэградацыя земляў і глеб. Неспрыяльныя геаэкалагічныя наступствы антрапагеннага выкарыстання зямельных і глебавых рэсурсаў.

Праблема апустыньвання. Маштабы праяўлення, асноўныя прыродныя перадумовы і антрапагенныя прычыны. Мерапрыемствы па прадухіленні апустыньвання і барацьбе з ім.

Праблема абязлесення. Маштабы праяўлення, асноўныя прыродныя перадумовы і антрапагенныя прычыны. Мерапрыемствы па прадухіленні абязлесення і барацьбе з ім.

Роля біёты ў біясферы і гаспадарчай дзейнасці чалавека. Роля раслін і жывёл як элементаў біясферы і іх значэнне для гаспадарчай дзейнасці чалавека. Біёта – крыніца харчовых і тэхнічных рэсурсаў.

Біялагічная і прыродная разнастайнасць Зямлі і праблема яго захавання. Асабліва ахоўныя прыродныя тэрыторыі ў свеце, іх тыпы і значэнне. Перспектывы развіцця асноўных асабліва ахоўных прыродных тэрыторый па мацерыках і краінах.

Практычная работа

7*[8]. Аналіз асноўных прыродных перадумоў і антрапагенных прычын апустыньвання.

---

[8]Выніковыя практычныя работы, пазначаныя знакам «*», могуць быць выкананы ў рамках тэматычнага кантролю.

8. Характарыстыка геаэкалагічнага стану прыроды сваёй мясцовасці і меры па яе ахове.

## АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Вучні:

ведаюць:

асаблівасці фарміравання і развіцця біясферы; прасторава-часавыя заканамернасці размеркавання жывых арганізмаў у біясферы; геаэкалагічныя асаблівасці біясферы; прасторава-часавыя заканамернасці фарміравання глебавага покрыва; пра ролю глеб у фарміраванні прыроднай разнастайнасці Зямлі; значэнне біясферы для чалавека і яго гаспадарчай дзейнасці; геаэкалагічныя наступствы антрапагеннага ўздзеяння на біясферу; асаблівасці працэсаў дэградацыі зямель, апустыньвання, абязлесення; асноўныя напрамкі рацыянальнага выкарыстання зямельных рэсурсаў; асаблівасці аховы натуральных ландшафтаў і прыроднай разнастайнасці Зямлі;

асноўныя паняцці: дэградацыя зямель, дэградацыя глеб, абязлесенне, апустыньванне, прыродная разнастайнасць;

умеюць:

выяўляць значэнне раслін і жывёл для розных відаў гаспадарчай дзейнасці;

аналізаваць прычыны і наступствы антрапагеннага ўздзеяння на стан прыроднага асяроддзя, асноўныя прыродныя перадумовы і антрапагенныя прычыны апустыньвання;

характарызаваць асаблівасці праяўлення геаэкалагічных праблем біясферы на розным тэрытарыяльным узроўні, геаэкалагічнага стану прыроды сваёй мясцовасці і верагодных мерапрыемстваў па яе ахове;

абгрунтоўваць неабходнасць аховы прыроды і рацыянальнага выкарыстання яе рэсурсаў;

вызначаць стан прыроднага асяроддзя сваёй мясцовасці;

называць і паказваць на карце тэрыторыі, дзе адбыліся прыродныя і антрапагенныя змяненні біясферы на розным тэрытарыяльным узроўні.

## САЦЫЯЛЬНА-ЭКАНАМІЧНЫЯ ГЛАБАЛЬНЫЯ ПРАБЛЕМЫ (54 гадзіны)

### Тэма 5. Дэмаграфічныя праблемы (10 гадзін)

Прычыны і праблема нераўнамернасці размяшчэння насельніцтва, глабальныя і рэгіянальныя праяўленні і наступствы. Прыбярэжны характар

сучаснага рассялення насельніцтва і наступствы. Перанасяленне як вынік нераўнамернасці размяшчэння насельніцтва.

Дэмаграфічны выбух і дэпапуляцыя ў свеце. Праблема росту і скарачэння колькасці насельніцтва свету. Адрозненні паміж развітымі краінамі і краінамі, якія развіваюцца, у дынаміцы колькасці насельніцтва. Праблема дэпапуляцыі.

Праблема дэмаграфічнай нагрузкі. Нераўнамернасць росту колькасці насельніцтва свету ў развітых краінах і краінах, якія развіваюцца. Асаблівасці каэфіцыента дэмаграфічнай нагрузкі ў развітых краінах і краінах, якія развіваюцца. Сацыяльна-эканамічныя наступствы павелічэння дэмаграфічнай нагрузкі. Прагноз змянення дэмаграфічнай нагрузкі ў свеце.

Праблема сям'і ў XXI стагоддзі, дэмаграфічныя перадумовы і рэгіянальныя адрозненні. Геаграфія шлюбнасці і разводнасці насельніцтва ў развітых краінах і краінах, якія развіваюцца. Сямейная палітыка.

Перадумовы старэння насельніцтва свету. Дынаміка ўзроставай структуры насельніцтва свету і рэгіёнаў. Размеркаванне асоб старэй за працаздольны ўзрост у свеце і рэгіёнах. Сутнасць праблемы старэння насельніцтва. Дэмаграфічныя і сацыяльна-эканамічныя наступствы дэмаграфічнага старэння. Міжнароднае рэгуляванне праблемы старэння насельніцтва.

Праблема міжнароднай міграцыі. Глабальны характар і наступствы міжнароднай міграцыі. Унутрана перамешчаныя асобы і праблема бежанства ў сучасным свеце. Віды міграцыйнай палітыкі ў свеце.

Шляхі вырашэння дэмаграфічнай праблемы. Дэмаграфічная палітыка і яе асаблівасці ў розных рэгіёнах і краінах. Замяшчальная міграцыя як форма дэмаграфічнай палітыкі.

Практычная работа

9. Дэмаграфічная нагрузка ў сучасным свеце: падабенствы і адрозненні развітых краін і краін, якія развіваюцца.

10. Дэмаграфічныя фактары і геаграфія шлюбнасці насельніцтва свету.

11. Аналіз дынамікі міжнароднай міграцыі ў рэгіёнах свету.

12*. Параўнальны аналіз дэмаграфічнай сітуацыі і дэмаграфічнай палітыкі ў развітых краінах і краінах, якія развіваюцца (на прыкладзе дзвюх краін на выбар).

## АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Вучні:

ведаюць:

асаблівасці нераўнамернасці размяшчэння насельніцтва; асаблівасці дынамікі колькасці насельніцтва свету, развітых краін і краін, якія развіваюцца; геаграфію дэпапуляцыі і краін з дэмаграфічным выбухам; геаграфічныя заканамернасці дэмаграфічнай нагрузкі, сацыяльна-эканамічныя наступствы яе павелічэння і прагноз змянення; дэмаграфічныя перадумовы праблем сям'і ў XXI стагоддзі, геаграфію шлюбнасці і разводнасці насельніцтва ў развітых краінах і краінах, якія развіваюцца, сутнасць сямейнай палітыкі; прынцыпы дэмаграфічнай палітыкі ў розных рэгіёнах і краінах; дынаміку ўзроставай структуры насельніцтва свету і рэгіёнаў; дынаміку старэння насельніцтва свету і рэгіёнаў; асаблівасці міжнароднай міграцыі ў рэгіёнах свету, прычыны праблемы бежанства і віды міграцыйнай палітыкі ў свеце;

асноўныя паняцці: дэмаграфічны выбух, дэпапуляцыя, дэмаграфічная нагрузка, дэмаграфічная палітыка, унутрана перамешчаныя асобы;

умеюць:

выяўляць прычыны адрознення дынамікі колькасці насельніцтва развітых краін і краін, якія развіваюцца;

характарызаваць узровень дэмаграфічнай нагрузкі;

аналізаваць геаграфічныя асаблівасці і наступствы дэпапуляцыі;

характарызаваць асаблівасці дэмаграфічнай палітыкі ў розных рэгіёнах і краінах;

аналізаваць наступствы дэмаграфічнага старэння;

выяўляць прычыны міжнароднай міграцыі і бежанства ў рэгіёнах свету;

характарызаваць геапалітычныя, дэмаграфічныя, сацыяльна-эканамічныя наступствы міжнароднай міграцыі і віды міграцыйнай палітыкі ў свеце;

знаходзіць падабенствы і адрозненні ў дэмаграфічнай нагрузцы ў развітых краінах і краінах, якія развіваюцца;

выяўляць дэмаграфічныя фактары, геаграфію шлюбнасці і разводнасці насельніцтва свету;

ажыццяўляць параўнальны аналіз дэмаграфічнай сітуацыі і дэмаграфічнай палітыкі ў развітых краінах і краінах, якія развіваюцца;

называць і паказваць на карце: краіны свету з высокімі тэмпамі росту колькасці насельніцтва; краіны свету з высокімі тэмпамі адмоўнай дынамікі колькасці насельніцтва; краіны свету з высокім узроўнем шлюбнасці насельніцтва (Фіджы, Егіпет, Узбекістан); краіны свету з высокім узроўнем разводнасці насельніцтва (Расія, Малдова, Беларусь).

### Тэма 6. Праблема ўрбанізацыі (8 гадзін)

Глабальныя і рэгіянальныя трэнды ўрбанізацыі. Асноўныя

геаграфічныя і сацыяльна-эканамічныя фактары, якія вызначаюць працэс урбанізацыі. Прасторава-часавыя тэндэнцыі і заканамернасці сусветнага працэсу ўрбанізацыі і росту гарадскога насельніцтва свету ў XXI стагоддзі. Прагноз урбанізацыі ў свеце.

Асноўныя праблемы урбанізацыі і гарадоў. Урбанізацыя і глабальная праблема росту буйных гарадоў. Перадумовы росту буйных гарадоў. Прасторавыя стадыі росту буйных гарадоў. Дынаміка колькасці і колькасці насельніцтва буйных гарадоў. Геаграфічнае размеркаванне буйных гарадоў свету. Праблемы росту буйных гарадоў у свеце.

Урбанізацыя і праблема якасці жыцця ў гарадах свету. Перадумовы праблемы якасці жыцця насельніцтва ў гарадах свету. Крытэрыі класіфікацыі гарадоў свету па якасці жыцця насельніцтва. Геаграфічныя адрозненні ў якасці жыцця насельніцтва гарадоў свету. Міжнародны вопыт рэгулявання праблемы якасці жыцця насельніцтва ў гарадах.

Урбанізацыя і змяненне клімату. Перадумовы праблемы ўрбанізацыі і змянення клімату. Уплыў урбанізацыі на змяненне клімату. Фактары, якія ўплываюць на ўзровень выкідаў у гарадах. Уплыў гаспадарчай дзейнасці гарадоў свету на змяненне клімату. Уплыў змяненя клімату на гарады.

Гарады і прыродныя рызыкі. Класіфікацыя прыродных рызык. Глабальная і рэгіянальная структура прыродных рызык гарадоў. Занальная структура гарадоў свету з прыроднымі рызыкамі.

Міжнароднае рэгуляванне праблемы ўрбанізацыі і развіцця гарадоў. Вырашэнне праблемы ўрбанізацыі росту гарадоў, роля ААН. Роля Аддзела народанасельніцтва Дэпартамента па эканамічных і сацыяльных пытаннях ААН. Роля Аддзела па Мэтах устойлівага развіцця ААН. Роля Праграмы ААН па населеных пунктах (ААН-Хабітат).

Практычная работа

13. Аналіз фактараў і рэгіянальных адрозненняў працэсу ўрбанізацыі ў развітых краінах і краінах, якія развіваюцца.

14. Параўнальны аналіз праблем урбанізацыі і змянення клімату ў гарадах развітых краін і краін, якія развіваюцца (на прыкладзе двух гарадоў на выбар).

## АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Вучні:

ведаюць:

асаблівасці дынамікі тэмпаў росту гарадскога насельніцтва свету ў развітых краінах і краінах, якія развіваюцца; сацыяльна-эканамічныя праблемы гарадоў развітых краін і краін, якія развіваюцца; перспектывы

развіцця ўрбанізацыі, асноўныя напрамкі і мерапрыемствы па паляпшэнні якасці навакольнага асяроддзя гарадоў;

асноўны тэрмін: прыродныя рызыкі;

умеюць:

характарызаваць асноўныя геаграфічныя і сацыяльна-эканамічныя фактары, якія вызначаюць працэс урбанізацыі;

вызначаць прасторава-часавыя тэндэнцыі і заканамернасці сусветнага працэсу ўрбанізацыі;

аналізаваць асаблівасці дынамікі тэмпаў росту гарадскога насельніцтва свету ў развітых краінах і краінах, якія развіваюцца; фактары і рэгіянальныя адрозненні працэсу ўрбанізацыі ў развітых краінах і краінах, якія развіваюцца;

характарызаваць сацыяльна-эканамічныя праблемы гарадоў развітых краін і краін, якія развіваюцца;

вызначаць перспектывы развіцця ўрбанізацыі, асноўныя напрамкі і мерапрыемствы па паляпшэнні якасці навакольнага асяроддзя гарадоў;

ажыццяўляць параўнальны аналіз праблем урбанізацыі і змянення клімату ў гарадах развітых краін і краін, якія развіваюцца;

называць і паказваць на карце: тры краіны свету з найбольшай колькасцю гарадскога насельніцтва свету (Кітай, Індыя, Інданезія); тры краіны свету з найбольшымі тэмпамі росту гарадскога насельніцтва (Руанда, Бутан, Лаос); тры краіны свету з найбольшымі тэмпамі скарачэння гарадскога насельніцтва свету (Барбадос, Ліхтэнштэйн, Таджыкістан); тры найбуйнейшыя агламерацыі свету (Токіа, Дэлі, Шанхай).

### Тэма 7. Харчовая праблема (7 гадзін)

Сельская гаспадарка – найважнейшы фактар вырашэння харчовай праблемы. Асноўныя фактары змяненняў у сельскай гаспадарцы свету і яго геаграфіі з канца XX стагоддзя. Новы погляд на сельскую гаспадарку свету і яе геаграфію ў XXI стагоддзі, глабальныя і рэгіянальныя асаблівасці.

Асноўныя праблемы развіцця сельскай гаспадаркі свету. Страты харчавання як адна з асноўных сучасных праблем развіцця сусветнай сельскай гаспадаркі. Уплыў змянення клімату на геаграфію сельскай гаспадаркі свету і харчовую бяспеку.

Прычыны голаду і харчовай праблемы ў свеце. Прыродныя, сацыяльна-эканамічныя і палітычныя прычыны голаду ў свеце. Геаграфія і структура харчавання насельніцтва. Рэгіянальныя аспекты голаду і харчовай праблемы. Міжнароднае вымярэнне голаду.

Харчовае забеспячэнне насельніцтва краін свету. Асноўныя сацыяльна-эканамічныя фактары забеспячэння харчаваннем. Краіны, якія

развіваюцца, у глабальнай харчовай сістэме. Тыпы краін па ўзроўні забяспечанасці харчаваннем.

Шляхі вырашэння харчовай праблемы. «Зялёная рэвалюцыя» і яе наступствы. Харчовая бяспека. Вымярэнне харчовай бяспекі.

Будучыня харчовай праблемы і развіцця сельскай гаспадаркі свету. Сусветныя выклікі ў захаванні харчовай бяспекі і развіцці сельскай гаспадаркі. Альтэрнатыўныя сцэнарыі магчымай будучыні харчовай праблемы і развіцця сельскай гаспадаркі. Сцэнарыі «былога курсу», «пераходу да ўстойлівага развіцця», «расслаення грамадства».

Практычная работа

15. Аналіз геаграфіі забяспечанасці краін свету асноўнымі відамі харчавання.

## АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Вучні:

ведаюць:

асноўныя фактары змяненняў у сельскай гаспадарцы свету і яе геаграфіі з канца XX стагоддзя; асноўныя праблемы страт харчавання ў сусветнай сельскай гаспадарцы; асаблівасці ўплыву змянення клімату на геаграфію сельскай гаспадаркі свету і харчовую бяспеку; прыродныя, сацыяльна-эканамічныя і палітычныя прычыны голаду ў свеце; геаграфію і структуру харчавання насельніцтва і магчымыя шляхі вырашэння глабальнай харчовай праблемы; асаблівасці рэгіянальных аспектаў голаду і харчовай праблемы; асноўныя сацыяльна-эканамічныя фактары забеспячэння харчаваннем; тыпы краін па ўзроўні забяспечанасці харчаваннем; магчымыя сцэнарыі будучыні харчовай праблемы;

асноўныя паняцці: голад, харчовая бяспека, «зялёная рэвалюцыя», устойлівае развіццё сельскай гаспадаркі;

умеюць:

аналізаваць прычыны і асаблівасці праяўлення глабальнай харчовай праблемы, геаграфію забяспечанасці краін свету асноўнымі відамі харчавання;

тлумачыць глабальнасць і рэгіянальныя асаблівасці голаду і харчовай праблемы;

характарызаваць краіны свету, якія развіваюцца, у дачыненні да іх становішча ў глабальнай харчовай сістэме;

вызначаць магчымыя шляхі вырашэння харчовай праблемы;

абгрунтоўваць неабходнасць аптымізацыі вытворчасці і выкарыстання прадуктаў харчавання ў краінах і рэгіёнах свету;

называць і паказваць на карце краіны свету з праблемай голаду (Цэнтральнаафрыканская Рэспубліка, Мадагаскар, Карэйская Народна-Дэмакратычная Рэспубліка).

## Тэма 8. Праблема вычарпання мінеральна-сыравінных рэсурсаў свету (7 гадзін)

Асаблівасці геаграфіі і развіцця горназдабыўной прамысловасці. Мінеральныя рэсурсы свету. Роля мінеральна-сыравінных рэсурсаў у прамысловасці. Геаграфія запасаў мінеральнай сыравіны ў свеце, групы краін забяспечанасці сыравінай. Радовішчы-гіганты. Геаграфічныя і сацыяльна-эканамічныя асаблівасці развіцця горназдабыўной прамысловасці.

Прыродна-рэсурсны патэнцыял тэрыторыі. Геаграфія запасаў і рэсурсазабяспечанасць свету асноўнымі відамі мінеральных рэсурсаў. Рэсурсны цыкл.

Рэсурсазабяспечанасць краін і рэгіёнаў свету па асноўных відах мінеральных рэсурсаў. Спажыванне мінеральна-сыравінных рэсурсаў у развітых краінах і краінах, якія развіваюцца.

Геаграфія мінеральных рэсурсаў Сусветнага акіяна. Мінеральныя рэсурсы Сусветнага акіяна. Значэнне мінеральных рэсурсаў Сусветнага акіяна для развіцця сусветнай гаспадаркі. Структура мінеральных рэсурсаў Сусветнага акіяна. Геаграфія запасаў і здабычы мінеральных рэсурсаў Сусветнага акіяна.

Шляхі вырашэння праблемы вычарпання мінеральна-сыравінных рэсурсаў. Рацыянальнае выкарыстанне мінеральна-сыравіннага патэнцыялу планеты. Адказнае спажыванне і вытворчасць. Роля рэсурсазберагальных і малаадходных тэхналогій у вырашэнні праблемы знясілення мінеральна-сыравінных рэсурсаў.

Практычная работа

16. Вызначэнне рэсурсазабяспечанасці краін свету асноўнымі відамі мінеральных рэсурсаў.

17*. Аналіз магчымых перспектыў асваення і праблем выкарыстання мінеральна-сыравінных рэсурсаў Сусветнага акіяна.

## АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Вучні:

ведаюць:

значэнне мінеральна-сыравінных рэсурсаў для гаспадарчай дзейнасці чалавека; геаграфію запасаў і рэсурсазабяспечанасці свету асноўнымі відамі мінеральных рэсурсаў; асаблівасці спажывання мінеральна-

сыравінных рэсурсаў у развітых краінах і краінах, якія развіваюцца; значэнне мінеральных рэсурсаў Сусветнага акіяна для развіцця сусветнай гаспадаркі і асаблівасці геаграфіі запасаў і здабычы мінеральных рэсурсаў Сусветнага акіяна; магчымыя шляхі вырашэння праблемы вычарпання мінеральна-сыравінных рэсурсаў;

асноўныя паняцці: прыродна-рэсурсны патэнцыял тэрыторыі, рэсурсны цыкл, геаграфічнае рэсурсазнаўства;

умеюць:

выяўляць значэнне прыродна-рэсурснага патэнцыялу для розных відаў гаспадарчай дзейнасці;

аналізаваць прычыны, фактары адрозненняў у рэсурсазабяспечанасці рэгіёнаў і краін свету асноўнымі відамі мінеральных рэсурсаў, магчымыя перспектывы асваення і праблемы выкарыстання мінеральна-сыравінных рэсурсаў Сусветнага акіяна;

тлумачыць глабальнасць і адноснасць праблемы вычарпання мінеральна-сыравінных рэсурсаў;

вызначаць магчымыя шляхі вырашэння праблемы вычарпання мінеральна-сыравінных рэсурсаў, рэсурсазабяспечанасць краін свету асноўнымі відамі мінеральных рэсурсаў;

прыводзіць прыклады рацыянальнага выкарыстання мінеральна-сыравінных рэсурсаў у краінах і рэгіёнах свету;

разлічваць паказчыкі рэсурсазабяспечанасці краін і рэгіёнаў свету мінеральнымі рэсурсамі;

называць і паказваць на карце краіны з лішкам рэсурсаў, забяспечаныя рэсурсамі і з дэфіцытам рэсурсаў.

## Тэма 9. Энергетычная праблема (6 гадзін)

Энергетычныя крызісы ў сусветнай гаспадарцы і іх уплыў на змяненне геаграфіі галіны. Прычыны энергетычных крызісаў у свеце. Энергетычныя крызісы ў сусветнай гісторыі і іх сутнасць. Першы, другі і трэці энергетычныя крызісы, прычыны, сутнасць, геаграфія і наступствы.

Дынаміка і прагноз спажывання энергетычных рэсурсаў. Прычыны глабальнай энергетычнай праблемы.

Дынаміка і прагноз спажывання энергетычных рэсурсаў у развітых краінах і краінах, якія развіваюцца. Уплыў энергетыкі на навакольнае асяроддзе. Геаэкалагічныя праблемы выкарыстання традыцыйных і альтэрнатыўных крыніц энергіі.

Шляхі вырашэння энергетычнай праблемы. Кароткая гісторыя шляхоў вырашэння энергетычнай праблемы. Рацыянальнае выкарыстанне энергетычных рэсурсаў свету і энергазберажэнне. Усеагульны доступ да сучасных крыніц энергіі.

Энергетычная бяспека. Перспектывы развіцця альтэрнатыўнай энергетыкі.

Практычная работа

18. Аналіз забяспечанасці краін свету асноўнымі відамі энергетычных рэсурсаў.

19. Параўнальны аналіз праблем выкарыстання традыцыйных і альтэрнатыўных крыніц энергіі.

## АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Вучні:

ведаюць:

прычыны, сутнасць, геаграфію і наступствы энергетычных крызісаў у свеце; значэнне энергетыкі для гаспадарчай дзейнасці чалавека; дынаміку і прагноз спажывання энергетычных рэсурсаў у развітых краінах і краінах, якія развіваюцца; асаблівасці ўплыву энергетыкі на навакольнае асяроддзе; прычыны ўзнікнення, асаблівасці праяўлення і магчымыя шляхі вырашэння глабальнай энергетычнай праблемы;

асноўныя паняцці: энергетычны крызіс, энергетычная бяспека;

умеюць:

выяўляць значэнне энергетыкі для розных відаў гаспадарчай дзейнасці;

аналізаваць дынаміку спажывання энергетычных рэсурсаў у развітых краінах і краінах, якія развіваюцца;

тлумачыць уплыў энергетыкі на навакольнае асяроддзе;

аналізаваць прычыны і рэгіянальныя асаблівасці праяўлення глабальнай энергетычнай праблемы, забяспечанасць краін свету асноўнымі відамі энергетычных рэсурсаў;

вызначаць магчымыя шляхі вырашэння энергетычнай праблемы;

абгрунтоўваць неабходнасць рацыянальнага выкарыстання традыцыйных і альтэрнатыўных крыніц энергіі ў краінах і рэгіёнах свету;

разлічваць паказчыкі забяспечанасці рэгіёнаў і краін свету энергетычнымі рэсурсамі;

ажыццяўляць параўнальны аналіз праблем выкарыстання традыцыйных і альтэрнатыўных крыніц энергіі;

называць і паказваць на карце краіны, якія скарачаюць спажыванне электраэнергіі (Вялікабрытанія, Германія, Італія); краіны з найбольшымі аб’ёмамі спажывання электраэнергіі (Кітай, ЗША, Індыя); электрастанцыі, якія працуюць на аднаўляльных энергетычных крыніцах (ветраэлектрастанцыя Ганьсу (Кітай); сонечны парк Тэнгэр (Кітай);

хвалевая электрастанцыя Pelamis P-750 (Партугалія); прыліўная электрастанцыя ў праліве Пентленд-Ферт (Шатландыя); геатэрмальная электрастанцыя Хедлісхейдзі (Ісландыя)).

Тэма 10. Геапалітычныя праблемы (8 гадзін)

Дынаміка палітычнай карты свету ў канцы XX – пачатку XXI стагоддзя. Колькасныя і якасныя змяненні на палітычнай карце свету ў XXI стагоддзі. Прычыны і наступствы геапалітычных праблем XXI стагоддзя. Праблема рэгіянальных канфліктаў. Шляхі вырашэння рэгіянальных канфліктаў.

Праблема міжнароднага тэрарызму. Прычыны і формы праяўлення міжнароднага тэрарызму. Дынаміка міжнароднага тэрарызму ў свеце. Міжнародныя меры па пераадоленні праблемы міжнароднага тэрарызму.

Праблема гандлю людзьмі. Формы праяўлення праблемы ў свеце, развітых краінах і краінах, якія развіваюцца. Дзейнасць міжнародных арганізацый па супрацьдзеянні гандлю людзьмі. Міжнародны вопыт пераадолення глабальнай праблемы гандлю людзьмі.

Сутнасць праблемы захавання міру і бяспекі. Праблема раззбраення. Праблема прадухілення ядзернай вайны і скарачэння ўзбраенняў. Міжнародны кантроль над ядзернай зброяй. Забарона хімічнай зброі.

Роля Беларусі ў вырашэнні геапалітычных праблем. Асаблівасці геапалітычнага становішча Рэспублікі Беларусь. Роля Беларусі ва ўрэгуляванні глабальных канфліктаў.

Роля міжнароднага супрацоўніцтва і ААН у вырашэнні глабальных геапалітычных праблем. Мэты развіцця тысячагоддзя прагрэс у вырашэнні праблем і новыя прыярытэты.

Практычная работа

20. Аналіз асноўных прычын сучасных рэгіянальных геапалітычных канфліктаў.

21. Параўнальны аналіз праблемы гандлю людзьмі (на прыкладзе дзвюх краін на выбар).

АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ
ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Вучні:

ведаюць:

асноўныя геапалітычныя праблемы XXI стагоддзя, іх прычыны і наступствы; магчымыя шляхі вырашэння рэгіянальных канфліктаў; прычыны, формы праяўлення і дынаміку міжнароднага тэрарызму; прычыны і формы праяўлення праблемы гандлю людзьмі ў свеце, развітых

краінах і краінах, якія развіваюцца; асноўныя асаблівасці праблемы захавання міру і бяспекі, раззбраення і прадухілення ядзернай вайны; магчымыя шляхі вырашэння глабальных геапалітычных праблем; пра ролю міжнароднага супрацоўніцтва і ААН;

асноўныя паняцці: рэгіянальны канфлікт, новыя незалежныя дзяржавы;

умеюць:

характарызаваць асноўныя геапалітычныя праблемы XXI стагоддзя, палітыка-геаграфічнае становішча краін свету;

аналізаваць прычыны і наступствы рэгіянальных канфліктаў у развітых краінах і краінах, якія развіваюцца;

выяўляць прычыны і формы міжнароднага тэрарызму;

выяўляць прычыны і формы праяўлення праблемы гандлю людзьмі ў свеце, развітых краінах і краінах, якія развіваюцца;

абгрунтоўваць неабходнасць захавання міру і бяспекі, раззбраення і прадухілення ядзернай вайны;

прыводзіць прыклады ўдзелу ААН у вырашэнні глабальных геапалітычных праблем;

ажыццяўляць параўнальны аналіз праблемы гандлю людзьмі;

называць і паказваць на карце: найноўшыя незалежныя дзяржавы на палітычнай карце свету, прызнаныя ААН (Усходні Тымор, Паўднёвы Судан, Эрытрэя); тэрыторыі рэгіянальных канфліктаў (араба-ізраільскі, інда-пакістанскі, карэйскі, тайваньскі).

### Тэма 11. Рацыянальнае прыродакарыстанне і ўстойлівае развіццё чалавецтва (6 гадзін)

Геаграфічная абалонка. Заканамернасці фарміравання геаграфічнай абалонкі. Асноўныя заканамернасці геаграфічнай занальнасці Зямлі. Прасторава-часавыя асаблівасці сучаснага функцыянавання і змяненні геаграфічнай абалонкі.

Рацыянальнае прыродакарыстанне. Гісторыя ўзаемадзеяння чалавека і прыроды. Прыродакарыстанне і яго асноўныя тыпы. Геаэкалагічныя прынцыпы, правілы, законы прыродакарыстання і аховы навакольнага асяроддзя. Прыродныя рэсурсы як аснова жыццядзейнасці чалавека і грамадства.

Геаэкалагічны стан навакольнага асяроддзя. Крытэрыі, паказчыкі і параметры геаэкалагічнага стану навакольнага асяроддзя. Сцэнарыі будучага стану навакольнага асяроддзя. Глабальныя мадэлі развіцця свету.

Магчымыя шляхі вырашэння глабальных праблем. Узаемасувязь глабальных праблем. Асаблівасці ўспрымання чалавекам праблем

навакольнага асяроддзя. Гуманітарна-экалагічны падыход і яго значэнне ў вырашэнні глабальных праблем.

Устойлівае развіццё чалавецтва. Паняцце і асноўныя прынцыпы ўстойлівага развіцця чалавецтва. Мэты ў галіне ўстойлівага развіцця чалавецтва на перыяд да 2030 года. Геаграфічныя аспекты Мэт устойлівага развіцця чалавецтва. Нацыянальная стратэгія ўстойлівага сацыяльна-эканамічнага развіцця Рэспублікі Беларусь на перыяд да 2030 года.

Практычная работа

22. Распрацоўка сцэнарыя вырашэння адной з глабальных праблем чалавецтва.

23*. Параўнальны аналіз геаграфічных аспектаў стратэгіі ўстойлівага развіцця чалавецтва і Рэспублікі Беларусь.

## АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Вучні:

ведаюць:

прасторава-часавыя асаблівасці змены геаграфічнай абалонкі; асноўныя перыяды гісторыі ўзаемадзеяння чалавека і прыроды; геаэкалагічныя прынцыпы, правілы, законы прыродакарыстання і аховы навакольнага асяроддзя; крытэрыі, паказчыкі і параметры геаэкалагічнага стану навакольнага асяроддзя; магчымыя сцэнарыі будучага стану навакольнага асяроддзя; пра ролю чалавека і яго гаспадарчай дзейнасці ў змяненні прыродных працэсаў; галоўныя палажэнні стратэгіі ўстойлівага развіцця чалавецтва і Рэспублікі Беларусь;

асноўныя паняцці: прыродакарыстанне, ахова навакольнага асяроддзя, стратэгія ўстойлівага развіцця;

умеюць:

характарызаваць асноўныя перыяды гісторыі ўзаемадзеяння чалавека і прыроды;

аналізаваць геаэкалагічныя прынцыпы, правілы, законы прыродакарыстання і аховы навакольнага асяроддзя;

абгрунтоўваць выкарыстанне прыродных рэсурсаў у залежнасці ад велічыні іх запасаў, гаспадарчай значнасці, патрэбнасці і мэтазгоднасці асваення;

вызначаць крытэрыі, паказчыкі і параметры геаэкалагічнага стану навакольнага асяроддзя;

характарызаваць асаблівасці ўзаемасувязі і праяўлення глабальных праблем чалавецтва на розным тэрытарыяльным узроўні;

вызначаць магчымыя шляхі, сцэнарыі і варыянты вырашэння глабальных праблем чалавецтва;

ажыццяўляць параўнальны аналіз геаграфічных аспектаў стратэгіі ўстойлівага развіцця чалавецтва і Рэспублікі Беларусь;

распрацоўваць сцэнарый вырашэння адной з глабальных праблем чалавецтва.

## Заключэнне (2 гадзіны)

Геаграфія ў сучасным свеце і яе галоўныя функцыі. Формы геаграфічнай дзейнасці і галіна прымянення геаграфічных ведаў.

Перспектывы развіцця геаграфіі. Міжнароднае супрацоўніцтва ў галіне геаграфіі і вырашэнне глабальных праблем чалавецтва.